Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 15 (514) | Субота, 12 красавіка 1941 года | Цана 20 кап.

Больш увагі абароннай літаратуры

Совецкі народ ні на адну хвіліну не забывае ўказанняў геніяльнага Сталіна аб тым, што Совецкі Саюз знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні, што магчлівы ўсялякія нечаканасці, калі вораг паспрабуе на нас напасці. Чырвоная Армія, выхаваная партыяй Леніна—Сталіна, гатова ў любы час стаць на абарону совецкай зямлі і разбіць ворага, які памкнецца напасці на нас, на яго тэрыторыі.

Другая імперыялістычная вайна з кожным днём усё шырыцца, у яе ўцягваюцца новыя краіны, новыя кантыненты. Вайна пагражае разрасціся ў сусветную.

Народны камісар абароны, маршал і Герой Совецкага Саюза С. К. Цімашэнка рэзка ставіць пытанне перад работнікамі чырвонаармейскага друку аб праўдзівым паказе рэчаіснасці. Некаторыя газеты, гаварыў маршал, «любяць некалькі прыхарошваць сапраўднае становішча. Імі кіруе зразумелае пачуццё гордасці за сваю акругу, за сваю дывізію, яны забываюць, што правільнае выхаванне магчыма толькі на сапраўдным становішчы». Не прыхарошванне, не лакіроўка сапраўднасці нам патрэбна ў літаратуры, а суровая праўда, гэта дапаможа ў выхаванні мужнасці, воленасці чырвоных байцоў, камандзіраў і палітработнікаў і ўсяго совецкага народа.

Абаронная літаратура мае велізарнейшае выхаваўчае значэнне. Добры мастацкі абаронны твор дапамагае нашай партыі ў справе выхавання маладых пакаленняў, ён прывівае глыбокія пачуцці да радзімы, мабілізуе на выпаўненне свяшчэннага абавязку — абароны нашай краіны. За апошнія годы совецкай літаратурай, самай перадавой і самай рэвалюцыйнай літаратурай у свеце, многа зроблена па лініі паказу гераічнага мінулага народаў СССР і ў першую чаргу вялікага рускага народа, паказу ў мастацкіх творах выдатных рускіх палкаводцаў. Даволі шырока паказаны ў совецкай літаратуры годы грамадзянскай вайны, яе героіка. Совецкі народ чытае і любіць кнігі А. Фадзеева, А. Новікава-Прыбоя, Д. Фурманава, В. Вішнеўскага, абаронныя вершы таленавіцейшага паэта совецкай эпохі В. Маякоўскага, Эд. Багрыцкага і многіх другіх.

Пісьменнікі Совецкай Беларусі—Якуб Колас, Янка Купала, М. Лынькоў, К. Крапіва, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў і другія далі на абаронныя тэмы шмат яркіх твораў, у якіх паказана гераічная барацьба беларускага народа за сваё вызваленне.

Аднак, усе гэтыя творы толькі пачатак вялікай работы. Пісьменнікі ў вялікім даўгу перад Чырвонай Арміяй і Ваенна-Марскім Флотам. Многія гераічныя справы совецкага народа не паказаны ў літаратуры, не знайшлі свайго мастака.

У беларускай совецкай літаратуры не паказан гераічны паход Чырвонай Арміі па вызваленню Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, тэма з'еднання вялікага беларускага народа ў адзіную совецкую сям'ю. Гэта тэма заслугоўвае сур'ёзнай увагі нашых паэтаў, празаікаў і драматургаў.

У баях з белафінамі Чырвоная Армія ўпісала бліскучую старонку ў гісторыю барацьбы совецкага народа, толькі ў літаратуры гэта яшчэ не паказана. Колькі ў нас Герояў Совецкага Саюза, вобразаў якіх не відаць у літаратуры. Прыклад: пад Мінскам, у пасёлку Кайкава, жывуць дзве сям'і Герояў Совецкага Саюза—т. т. Анцілеўскага і Матрунчыка, хата супроць хаты. Хіба гэта не можа служыць матэрыялам для напісання мастацкага твора!

У часцях Заходняй Асобай Ваеннай Акругі ёсць многа здольных паэтаў і пісьменнікаў. Да ліку іх адносяцца палкоўнік тав. Аляксееў, чырвонаармейцы т. т. Семяніхін, Панамароў і многія другія. За апошні час ажывілі сваю работу пісьменнікі рускай секцыі ССП БССР—тт. В. Глазырын, Л. Шапіра, Е. Садоўскі, Л. Хахалін, М. Кручкін і інш., якія напісалі рад новых апавяданняў і навел на абаронныя тэмы.

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР аднавіла сваю абаронную камісію. Камісіі неабходна аказаць садзейнічанне ў рабоце, дапамагчы ёй у справе выдання альманаха абароннай літаратуры.

Трэба, каб пісьменнікі БССР аказалі дапамогу часцям Чырвонай Арміі ў справе напісання гісторый дывізій, палкоў, брыгад, вайсковых школ. Напісанне гісторый мае выключнае значэнне для выхавання маладых чырвонаармейцаў у духу гераічных традыцый Чырвонай Арміі. Кожны чырвонаармеец павінен ведаць паходы, якія ўзначальвалі баявыя камандзіры — Чапаеў, Катоўскі, Пархоменка, Шчорс, Орджанікідзе, Фрунзе, Будзённы, Цімашэнка, Варашылаў, успрыняць баявыя традыцыі часцей Чырвонай Арміі і далей удасканальваць уменне перамагаць ворагаў.

Сярод пісьменнікаў БССР, па прыкладу Масквы, неабходна наладзіць сур'ёзную, паглыбленую ваенна-тэарэтычную вучобу.

Вялікую ўвагу пытанням развіцця абароннай літаратуры аддае Упраўленне палітычнай прапаганды Заходняй Асобай Ваеннай Акругі. У бліжэйшы час мяркуецца правесці творчую канферэнцыю чырвонаармейскіх пісьменнікаў і паэтаў. Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР павінен аказаць максімальную дапамогу чырвонаармейскім паэтам і пісьменнікам з мэтаю ўзняцця іх прафесіянальнага майстэрства, аўладання формай, стварэння паўнацэнных высокамастацкіх абаронных твораў.

Наша краіна, Чырвоная Армія, увесь совецкі народ чакае ад совецкіх пісьменнікаў новых твораў на абаронныя тэмы, якія-б дапамаглі мацаваць магутнасць Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Да 11-годдзя з дня смерці В. Маякоўскага

Маякоўскі ў комсамольскай прэсе Беларусі

Агульнавядома, што Уладзімір Маякоўскі быў цесна звязан з комсамолам і прымаў самы актыўны ўдзел у комсамольскай прэсе. Штодзённая практычная сувязь з комсамольскай аўдыторыяй, работа ў «Комсомольской правде» займае цэнтральнае месца ў творчым жыцці паэта апошніх трох год. Сам Маякоўскі не схілен быў прыўмяншаць значэнне сваёй работы ў газеце. Яна шчыльна наблізіла яго да такога разумення паэтычнай справы, пры якім яна робіцца сапраўды дзейснай, жыццёва-неабходнай справай. Вось чаму ва ўсіх анкетах, адказваючы на пытанне: «спецыяльнасць», «род занятка», Маякоўскі пісаў не «паэт», не «літаратар», а—«карэспандэнт «Комсомольской правды». У яго вуснах гэта гучала небывалай гордасцю. Прад'яўляючы безліч карэспандэнцкіх пасведчанняў, Маякоўскі даводзіў сваё права прысутнічаць на Усесаюзным злёце піонераў: «Я газетчык, я павінен усё бачыць...» Злёт адбываўся ў жніўні 1929 года. Маякоўскі інтэнсіўна працаваў тады ў «Комсомольской правде».

Гэтай арыентацыі Маякоўскага на работу ў комсамольскай газеце, як на асноўную сваю работу папярэднічалі неаднаразовыя эпізадычныя спробы яго наблізіцца да комсамольскай прэсы. Адным з гэтых ранніх вопытаў творчага садружаства Маякоўскага з комсамольскай аўдыторыяй трэба лічыць яго ўдзел у комсамольскай прэсе Беларусі.

Праглядаючы камплекты газеты «Красная смена» (цяпер «Чырвоная змена») за 1923 год, нам удалося выявіць у трох яе нумарах цыкл антырэлігійных вершаў Маякоўскага. У № 8 (65) ад 7 сакавіка змешчан верш «Еще одно «долой»!, у № 12 (69) ад 31 сакавіка — верш «Письмо богу» і ў № 13 (70) — верш «Не для нас поповские праздники», надрукаваны з заметкай: «Для «Красной смены». Вось яго тэкст (з захаваннем транскрыпцыі, арфаграфіі і пунктуацыі):

«**В. Маяковский.**

Не для нас
поповские
праздники

Пусть богу старухи молятся.
Молодым—
не след по церквам.
Эй,
Молодежь,
Комсомольцы —
Призывом летят к вам:
Что толку справлять Рождество?
Елка —
дурням только.
Поставят елкин ствол,
и топочут вокруг польки.
Коммунистово Рождество:
день Парижской Коммуны.
В нем родилась,
и со дня с того
Коммунизм растет юный.
Кровь,
что тогда лилась
Парижем
и грязью предместий
Октябрем разгорелась,
разбурлясь рабочей местью.
Вы вызнали правду книг.
Книга —
невежд лекарь.
Не земных,
не небесных иг
Не допустим спине человека.
Чем кадилами вить кольца
богов не бывших чествуя,
Мы
в Рождестве комсомольца
повели безбожные шествия.
Теперь
Воскресенье Христово
попом сочиненная пасха.
Для буржуев
новый повод
осушить с полдюжины насухо
куличи
— в человечий рост
уставят столы Титов.
Это Титы придумали пост:
подогревание аппетитов.
Пусть жалуется Тит постом
наш ответ — прост
мы постили лет сто —
нам нужен хлеб —
а не пост.
Хлеб не лезет в рот.
Должны добыть сами.
Поп врет
о насыщении чудесами.
Не нам поп-няня.
Христу отставку вручите.
Наш наставник — знание,
Книга —
наш учитель.
Отбрось суеверий сеянье,
отбрось религии обряд.
Коммуны воскресенье
25 октября.
Наше место не в церкви грязненькой
На улицы!
Плакат в руку.
Над верой
в наши праздники
Огнем рассияй науку».

Вершы «Еще одно «долой»! и «Письмо богу» былі перадрукаваны ў пажыццёвых і пасмяротных выданнях Маякоўскага: першы — у зменёнай рэдакцыі, пад назвай «Долой» — увайшоў як пачатковы, уступны раздзел, у сялянскі агітлубок «Ни знахарь, ни бог, ни ангелы бога — крестьянству не подмога», які выйшаў асобнай брашурай у 1923 годзе; другі — пад другой назвай («После из'ятий») — друкаваўся ў «Красном журнале для всех», № 1 за 1922 год, і ўвайшоў у II том збору твораў паэта.

Верш «Не для нас поповские праздники» не знойдзен ні ў адным з пажыццёвых выданняў паэта. Не ўвайшоў ён і ў поўны збор твораў Маякоўскага. Такім чынам, трэба меркаваць, што гэты верш напісан Маякоўскім спецыяльна па просьбе і заказу газеты «Красная смена».

У вершы «Не для нас поповские праздники» вельмі моцна адчуваецца ўплыў першых агітацыйных рэчаў Маякоўскага. У прыватнасці, у ім чуюцца водгукі богаборчага, атэістычнага пафасу «Містэрыі-буфф», у якой смелая і захапляючая мара паэта аб **сапраўдным,** земным раі ўступала ў барацьбу з усімі сіламі «галоднага неба» евангелістаў, «где постники лижут чай без сахара». Параўнайце: «Пусть жалуется Тит постом, наш ответ — прост: мы постили лет сто—нам нужен хлеб, а не пост». З другога боку, у гэтым вершы ёсць паасобныя рысы, якія будуць выкарыстаны Маякоўскім у яго далейшай паэтычнай рабоце: элементы маршавай пабудовы верша. Асобныя радкі з верша «Не для нас поповские праздники» аказаліся перанесенымі паэтам у верш «Наше воскресенье», надрукаваны 7 красавіка 1923 года ў «Известиях ВЦИК». Верш «Не для нас поповские праздники» пачынаецца радком: «Пусть богу старухи молятся»; у «Нашем воскресеньи» амаль такі-ж пачатак: «Еще старухи молятся». У абодвух вершах паўтараецца радок: «Коммуны воскресенье 25 октября» («Не для нас...»); «Коммунистов воскресенье 25-е октября» («Наше воскресенье»). Паўтараецца ў абодвух вершах і супрацьстаўленне маладога совецкага свята рэлігійным абрадам у брудненькай царкве; паўтараецца сама рыфма: «праздники—грязненькой....»

Асобныя матывы і вобразы, якія ўзніклі ў працэсе работы Маякоўскага над агітацыйнай антырэлігійнай тэмай, атрымалі своеасаблівае другое жыццё і ў яго ўласна-лірычных вершах і паэмах. У прыватнасці, сатырычны вобраз ёлкі, каляд («Поставят елкин ствол и топочут вокруг польки») даў найбольш яркае і поўнае афармленне паэтычнага матыву нездавалення мяшчанскім бытам,—матыву, які з'яўляецца асноўным у паэме «Про это».

Над гэтай паэмай Маякоўскі працаваў у студзені-лютым 1923 года, г. зн. амаль у той-жа час, калі ён пісаў антырэлігійныя вершы «Не для нас поповские праздники», «Наше воскресенье» і інш. У паэму ўвайшлі паасобныя вобразы і матывы гэтых агітацыйных вершаў, але — падпарадкоўваючыся якасна-другому заданню.

Лірычныя паэмы Маякоўскага і яго агітацыйныя вершы выраслі з адной крыніцы: з пачуцця нянавісці да старога ўласніцкага ладу, умацаванага рэлігіяй і стогадовым аўтарытэтам, з пачуцця любві да «заўтрашняга і паслязаўтрашняга чалавецтва». Ратаваць паэта, прыкаванага да маста канатамі радкоў («Про это»), прыходзіць не Хрыстос, а комсамолец, — той, да каго звернуты вершы, напісаныя амаль адначасова з «Про это»:

Шагайте,
да так,
комсомольцы,
чтоб у неба звенело в ухе!

Вялікую цікавасць з пункту гледжання станаўлення агітацыйнага стылю сялянскіх лубкоў Маякоўскага ўяўляюць тыя праўкі і змяненні, якія паэт уносіў у вершы, надрукаваныя ў мінскай газеце «Красная смена»—«Письмо богу» і, асабліва, «Еще одно «долой»!

Летам 1923 года Я. Шафір ездзіў у былую Варонежскую губерню высвятляць: ці разумеюць сяляне мову газеты. Аказалася, што сялянскі чытач не разумее такіх слоў, як «павільён», «аўтарытэт», «гарызонт». Амаль у той-жа час на з'ездзе работнікаў друку выступіў таварыш М. І. Калінін, які патрабаваў ад газетчыкаў большай увагі да стылю і формы газеты. Маякоўскі вельмі цёпла сустрэў гэту прамову. Ён пісаў: «Ва ўсіх газетах дасюль мільгаюць прывычныя, але нікому незразумелыя, нічога не выражаючыя ўжо фразы «праходзіць чырвонай ніццю», «дасягнула апагею», «дайшло да кульмінацыйнага пункту», «пацярпела фіяска» і г. д., і г. д. без канца». Аб гэтым пісаў ён і ў вершы: «то, что годится для иностранного словаря, газете — не гоже».

Свае ўласныя вершы Маякоўскі пераглядаў з пункту гледжання даходчывасці і блізасці іх масаваму чытачу, у данным выпадку — сялянскаму чытачу. Варыянт верша «Еще одно «долой»!, надрукаваны ў газеце «Красная смена», пачынаецца так: «Мы сбросили с себя **буржуево** ярмо». Уключаючы гэты верш у сялянскі агітлубок «Ни знахарь, ни бог, ни ангелы бога — крестьянству не подмога», Маякоўскі змяняе ўказаны радок адпаведна ўмовам сялянскага жыцця: «Мы сбросили **помещичье** ярмо». Дробная, але характэрная праўка.

У варыянце агітацыйнай паэмы для сялян адсутнічае такі паэтычна эфектны радок, які знаходзіцца ў яе газетным варыянце: «Мы отвели от горл блокады нож». Слова «блокада», ды яшчэ ў такім метафарычным спалучэнні, магло паказацца Маякоўскаму паэтычнай «раскошай», зацямняючай прапагандысцкую задачу твора. Бязлітасна ачышчаючы верш ад залішняй «прыгажосці», Маякоўскі разам з тым узмацняе яго рытмічную і інтанацыйную выразнасць. Замест вялага:

чтобы, проповедуя смиренье и посты,
попы,
в тиши монаших келий... —

Маякоўскі піша больш моцна і выразна:

чтоб, проповедуя
смиренье и посты,
ногами
в тишине монаших келий,
за пояс
закрутивши
рясовы хвосты,
откалывали
спьяну
трепака
да поросенка с хреном ели.

Такім чынам можна сказаць, што надрукаваныя ў мінскай комсамольскай газеце «Красная смена» антырэлігійныя вершы Маякоўскага з'яўляюцца характэрным прыкладам работы паэта над агітацыйнай тэмай. Комсамол Беларусі мае права ганарыцца тым, што пры калысцы яго баявога друку стаяў лепшы і таленавіцейшы паэт совецкай эпохі — Уладзімір Маякоўскі.

Г. БЯРОЗКІН, Н. СУРНАЧОЎ.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР скульптар-ордэнаносец **З. Азгур** рыхтуе да Усесаюзнай мастацкай выстаўкі «Наша радзіма» манументальную скульптуру «Сталін у ссылцы». **На здымку:** тав. Азгур ля эскіза скульптуры ў сваёй майстэрні. Фота І. Шышко (БЕЛТА).

Пятро Глебка

РАЗМОВА ПА ДАРОЗЕ

Па дарозе з Ганцэвіч на Столін
Чуў я гэты праўдзівы расказ
І, хоць формай яго нездаволен,
Выпраўляю ў жыццё без прыкрас.

«Я гарачую маю натуру,
А мяне непаслушны лёс
У глухую мясціну, пад Тураў,
На балотныя землі занёс.

Мне да сэрца прасцяг багаты,
А як выйдзеш у нас на двор —
Каля самага ганку хаты
Абрываецца куцы прастор.

Ад цікаўных вачэй кругавіды
Засланяе балотны хмызняк,
Цёмны зараснік горкай ракіты
І крывы лапушысты лазняк.

Я люблю, каб пшаніцы шалелі
На бязмежнай усёй шырыні,
Каб пад сонцам стаялі і млелі
Маладыя палі ярыны.

А паглядзіш — над ціхаю рэчкай,
На палянках у ціхіх лясках
Толькі нізкая, чорная грэчка
Даспявае на жоўтых пясках.

Я хацеў-бы на прагнай машыне
Чортам вымчаць за ветрам услед,
Каб спявалі на гравіі шыны,
Як суладжаны, стройны квартэт.

А паедзеш — разбітыя грэблі,
І на кожным кіламетры — гаць,
І галосіць машына у дзебрах,
І рэсоры пакутна скрыпяць.

І няма для жаданых палётаў
Неабходнай табе шырыні —
Абступіла навокал балота,
І нічым ты яго не крані.

Але ёсць чалавек неспакойны,
Што і ў гэты турботны час,
Калі ў свеце крывавыя войны —
Не забыў пра Палессе і нас.

Бышцам ведаў маю ён натуру,
Што такі даў праўдзівы загад,
Каб Старобін і Любань, і Тураў
Асушыць і засеяць падрад.

Значыць, я з гэтай памятнай даты
На пятнаццаць бліжэйшых год
Ёсць закліканы меліяратар,
І на багну выходжу ў паход.

Мы глыбока прарэжам каналы,
На дрыгве узрасцім ураджай,
І багаты жыццём небывалым
Стане родны Палескі мой край».

Вось які па дарозе на Столін
Я пачуў быў аднойчы расказ
І, хоць формай яго нездаволен,
Выпраўляю ў жыццё без прыкрас.
Мінск, 11. IV. 41.

У партарганізацыі ССП БССР

7 красавіка адбыўся чарговы адкрыты сход партыйнай арганізацыі ССП БССР, на якім былі разгледжаны: заява паэта-ордэнаносца Пятра Глебкі аб прыёме яго кандыдатам у члены КП(б)Б і заява кандыдата партыі тав. А. Куляшова аб прыёме яго ў члены КП(б)Б.

У абмеркаванні заявы тав. Глебкі прынялі ўдзел тт. Броўка, Кучар, Кацовіч, Крапіва, Вольскі, Лынькоў Р., Клімковіч, Стаховіч, Лынькоў М. Выступаўшыя ахарактарызавалі тав. Глебку, як таленавітага паэта і драматурга, шмат зрабіўшага на карысць совецкай літаратуры, і як актыўнага грамадскага работніка. Партыйная арганізацыя аднагалосна прыняла тав. П. Глебку кандыдатам у члены КП(б)Б.

Пры актыўным удзеле ўсіх комуністаў-пісьменнікаў была абмеркавана заява тав. А. Куляшова. Выступаўшыя тт. Клімковіч, Агняцвет, Мазо, М. Лынькоў, Модэль і іншыя адзначалі творчы рост А. Куляшова, пашырэнне тэматыкі яго твораў. Адначасова выступаўшыя ўказалі на неабходнасць тав. Куляшову больш працаваць над аваладаннем марксісцка-ленінскай тэорыяй, глыбока вывучаць гісторыю партыі і прымаць больш актыўны і дзейсны ўдзел у грамадскай рабоце. Партыйная арганізацыя аднагалосна прыняла кандыдата ў члены КП(б)Б тав. Куляшова ў члены КП(б)Б.

На гэтым-жа сходзе было абмеркавана пытанне падрыхтоўкі да Першага мая. Зацверджан склад камісіі па падрыхтоўцы да надыходзячага вялікага свята.

Міхась Машара

Ваколіца сініх балот

З песень мінулага

Замёрлі ваколіцы сініх балот...
Сухая сіта і асокі шумяць
Трывожна і сумна...
Заціхлі пад лёдам
прасторы балот
І азёрная гладзь.

Накрыліся белым абрусам імшары...
Уладаркай прышла на балоты зіма.
І воч не падняць мне пад нейкім
пяжарам

І нейкая сцюжа на сэрцы лягла.
Таптаныя сцежкі,
дарожкі і тропы
напроста вядуць да сялянскіх сяліб,
дзе ўецца дымок над саломеным
стропам
і хаты глядзяцца
бяльмом нямых шыб.

Мяцель завірыцца ў шалёным разгоне,
ляцяць табуны белагрывых каней
і стогне,
і плача,
і песнямі звоніць, —
і гора таму, хто спаткаецца з ёй.

2

Зімовая песня...
Снягі і марозы...
Ну, як тут вясёлым і радасным быць?
Пяю белапенным у полі бярозам,
вучуся у сэрцы людскія званіць.

У ваколіцах сініх балотаў ёсць людзі,
і сэрца іх б'ецца,
і вочы гараць,
ды некалі нехта душу іх запудзіў,
навучыў іх звярыную долю кахаць.

Праклятае ўчора...
і шэрае сёння,
а заўтра загадкай у далях стаіць,
хтось зблытаў ім думы,
і змест,
і пытанні,
і кінуў па сініх балотах блудзіць.

3

Так многа на свеце
ваколіцаў сініх...
без ліку нязнаных азёр і балот.
Сягоння мяцель карагодзіць над імі
агнёмападаючых зораў на лёд.

Звярыныя тропы
занесены снегам.
Ваўчыца брыдзе па здабычу да хат.
Жыццё не застрашыць
пагрозай і смехам,
а голад не пусціць вярнуцца назад.

Так многа на свеце
бяздомных і босых
У спакоі пад снегам заснуўшай зямлі.
Мо' лёс ім і долю украў хто з-пад носу,
а мо' яны рана на свет наш прышлі?

Пытанні... Пытанні...
Ну, хто тут паможа
адказу шукаць
і знайсці на ўсё?

Вузлы не развяжаш —
разтнеш хіба нажам—
вузлы, што вязалі вякамі жыццё.

4

Вучуся спакою,
як снежнае поле,
і сэрцу гутору:
— змірыся, маўчы, —
каб дум не муцілі —
ні бунты,
ні болі
на млечным узоры зімовай начы.

Хацеў-бы я выславіць песняй Краіну,
дзе многа азёраў, пяскоў і балот,
і сэрцам паэта,
і чуласцю сына
адчуць над снягамі жывы веснаход.

І кожную радасць,
і кожнае гора
з-пад стрэх саламяных
як птушку зlавіць,
жыццём яе вёсак, палёў і прастораў
у сэрцы людскія
як звонам званіць.

. . . .

Зімовыя песні
спяваюць мяцелі,
Руччы і крыніцы пад лёдам усе,
і шэрыя будні за столам заселі,
а ў сэрцы ўсцяж думы
аб светлай вясне.

5

Брыду па прасторах балота і моху...
Марозы скавалі навокал усё...
І неяк не шкода
нічога — ні трохі,
і неяк не страшны —
ні смерць, ні жыццё.

Сухія сасонкі са снегам на карку,
пад снегам багун і п'янічнік сухі.
Тут воўк і ваўчыха вядуць гаспадарку,
Няма за лісіцу спрытнейшай слугі.

Я знаю, што гэта не смерць над
Краінай,
а толькі зіма,
як штогод над зямлёй.
Вясны дачакае, хто моцны і звінны,
хто сэрца напоіць з крыніцы жывой.

6

Ніхто яшчэ сініх балотаў не мераў,
апроч толькі ветру ціхога зімой,
а ўсё-ткі-ж глыбока і шчыра я веру—
яны закрасуюцца іншай красой.

Прыдуць сюды людзі з упартаю воляй,
разрэжуць балоты —
уздоўж і ўдаль,
на тропах звярыных
імпэтам вясёлым
зазвоняць машыны
і войстрая сталь.

І песні другія пачуюць прасторы,
і новую радасць сюды прынясуць,
і выкінуць скарбы на бераг азёры,
і сонцам расквеціцца
дзікая жудзь.

. . . .

Зімовая песня
аб сініх балотах...
За вокнамі вецер махае крылом.
Плывуць мае думы
нямым карагодам
над роднай Краінай
і сонным жыццём.
«Ваколіца сініх балот». Зіма, 1939 г.

Творчасць Ванды Васілеўскай

★ А. Дэгаль ★

Калі спрабуюць вызначыць месца Ванды Васілеўскай у польскай літаратуры, перад даследчыкамі перш за ўсё ўстае знамянальны факт: вялікая папулярнасць, якая спадарожнічае пісьменніцы ўжо ад першай яе кнігі «Аблічча дня». Факт гэты тым больш знамянальны, што польскія кнігарні ў апошнія годы існавання Польшчы былі перапоўнены масай перакладаў з твораў выдатных аўтараў, часта з сусветнай славай, не гаворачы ўжо аб паводцы менш вартай белетрыстыкі, якая мела заданне «прыемна заняць час» чытача. У такіх умовах здабыць чытача і папулярнасць было нялёгка. Аднак Васілеўская здабыла яе вельмі хутка.

Чым гэта тлумачыцца?

Так-званая афіцыйная польская літаратура, прадстаўнікамі якой былі Калэн-Бандроўскі, Серашэўскі і Гэтэль, была ілжывай. Гэтыя пісьменнікі, пасля кароткіх і няўдалых спроб апаэтызіравання буржуазнай «незалежнасці», пагоні за «белай гускай», якую яны намагаліся ператварыць у ганарыстага арла, — адмовіліся ўрэшце ад гэтай «радаснай творчасці» і ўзяліся за майстраванне мутных сацыяльных твораў. Рабіў гэта асабліва заўзята Бандроўскі, гэты так-званы паслядовец Жэромскага. Імкнучыся ідэалізіраваць пілсудчыну, Бандроўскі ў абстаноўцы вельмі шэрай рачаіснасці бачыў у апошнія годы адзіную магчымасць дасягнення сваёй мэты толькі спосабам ахмаўлення, абвялічвання палітычных праціўнікаў, у дэмаскіраванні дробнабуржуазных партый, якія грызліся з пілсудчыкамі за доступ да дзяржаўнага карыта.

Вядомая пісьменніца Налкоўская, якая сімпатызіравала дэмакратычнаму руху, усё больш адыходзіла ад нямілай рачаіснасці буржуазнай Польшчы ў свет абстрактнага псіхалагізіравання, лабараторна здабываючы «корань корання». Розныя «расісты» Гэтэлі намагаліся схаваць сваю мізэрнасць і спрабавалі насыціць галадаючыя «армейскія» масы, у якіх не было нават хлеба, гонарам за сваю «абранасць». Радзевічава істэрычным голасам заклікала народ «засланіць яе шляхецкі двор ад небяспекі з усходу», спакойна сцвярджаючы, што двор—гэта айчына, якая знаходзіцца ў небяспецы і за якую трэба аддаць жыццё.

Было гэта, бадай, адзінае ў пасляваеннай Еўропе з'явішча, калі ажыла псеўда-«дэмакратычная» шляхетчына. Тупая, хцівая і скнарлівая, яна крычала аб «незалежнасці» і апукала народ, прысягаючы пры гэтым як перакупшчыца на рынку, мешаным жаргонам, узятым са слоўніка ўсіх палітычных партый.

Сярод гэтай афіцыяльнай маны, адзінай у сваім родзе ў жыцці і літаратуры, голас Ванды Васілеўскай загучаў з нечуванай вырашанасцю і нязмернай сілай. Шырокія масы чытачоў прагна прыслухоўваліся да гэтага голасу. І не гледзячы на тое, што ў «Абліччы дня» голас гэты яшчэ не авалодаў усімі мастацкімі рэгістрамі,—бо гэта голас пісьменніка, які выказваўся пасля доўгага маўчання, горача, адным дыханнем хочачы сказаць усё адразу. Чытач адразу адчуў, што гэты голас ідзе з глыбіні гарачага, узрушанага сэрца, што гэта голас самога жыцця.

У сваю першую кнігу «Аблічча дня» Васілеўская ўклала гнеўную страсць справядлівага чалавека, які бачыць крыўды і пакуты, бачыць супярэчнасці капіталістычнага ладу: багацце і страшэнныя нястачы, перанасычэнне і голад, пышнасць і лахманы. Перш за ўсё Васілеўская малюе ў кнізе галечу ў самых рознастайных яе праявах—беспрацоўе, бяздомнасць, прастытуцыю, хваробы і тое, што маюць «шчасце» працаваць. Васілеўская імкнецца паказаць усё, яна прагне выявіць тыповасць з'яў. і таму героі гэтай кнігі не індывідуалізіраваны, яны носяць некалькі імёнаў, хоць ёсць іх легіён.

Таму аўтар таксама знаходзіць агульныя для ўсіх рысы, знешне дубліруючы герояў, адсюль-жа ідзе фрагментарнасць кампазіцыі і лаканічны тэлеграфны стыль, стыль рэпартажу. Аўтар хоча ўзрушыць чытача бяздоннем галечы і нястач рабочых кварталаў і не шкадуе шэрых, цмяных фарбаў, ён паказвае струхлелыя бярлогі, зжэртых нястачамі і змрокам людзей. Часамі ад гэтага згушчэння цмяных фарбаў і сцэн галечы робіцца цяжка і душна. Піск галечы і нянавісці даходзіць да такой вышыні, што выбух становіцца няўхільным.

Рэвалюцыя настае ў кніжцы таксама неспадзявана, стыхійна. Але мы не ўпэўнены, які будзе яе вынік. Задумваешся, ці будуць здольны знясіленыя нястачамі людзі да пераможнай барацьбы супроць арганізаванага гвалту, ці не будзе гэта толькі распачлівым стыхійным прарывам. Бо найвялікшая галеча і нянавісць не здолее зрабіць рэвалюцыю пераможнай, калі яна не будзе старанна і арганізавана падрыхтавана кадрамі свядомых рэвалюцыянераў.

Калі мы не бачым гэтага досыць выразна ў «Абліччы дня», дык прычынай з'яўляецца тое, што ва ўмовах цэнзуры Польшчы цяжка было паказаць працэс нелегальнай барацьбы і арганізацыі рабочых. І таму ў гэтай кніжцы столькі туманных мясцін і недагаворак там, дзе гаворка ідзе пра канкрэтную барацьбу.

«Аблічча дня»—перш за ўсё падсумоўванне той галечы і крыўды, якія гнялі прадмесці гарадоў Польшчы. Кніга была гнеўным абвінавачаннем і пагрозай, якія Васілеўская кінула ў твар стваральнікам гэтай кашмарнай рэчаіснасці ў буржуазнай Польшчы.

Разуменне айчыны дала масам французская рэвалюцыя, каб скарыстаць яго для сваіх мэтаў. Але гэта прыгожае і прыцягальнае слова мела заўсёды для мас трагічны сэнс. Біла іх і эксплаатыравала буржуазная айчына за іх любоў і тугу да яе.

У аповесці «Айчына» Васілеўская аналізіруе істотны сэнс гэтага ва ўмовах польскага капіталізма. Аб'ектам яе назірання тут з'яўляецца маёнтак і супярэчнасці паміж сельскагаспадарчымі рабочымі і панам.

Пан, эканом, праца ад світання да ночы, біццё па твары, надругання блудлівага пана над прыгожымі сялянкамі — гэтыя кашмарныя поўфеадальныя ўмовы гнятуць сялянскую масу, выціскаюць з яе пот і кроў, на якіх ўзнёсся ўгору другі свет—панскі. Якая-ж жахлівая гэта айчына, ад якой патыхае лахманамі, жабрачай стравай і безнадзейнасцю...

Аднак гісторыя мела свой 1905 год, які пачаў хістаць гэту сярэдневяковую будоўлю. Тое, што здавалася знясіленым працай сялянам вечным, пачало разбурацца. Батрак Кржысяк арганізуе дапамогу тым, хто шырыць гэта разбурэнне. бо «бачыў ён айчыну недалёка, за тонкай сцяной, якую трэба зваліць». Кржысяка ўцягваюць у тэрарыстычныя выступленні нацыяналістычныя групы, якія абяцаюць яму «айчыну». Аднак прайшла першая хваля, якая ўдарыла па царызму, пакінуўшы Кржысяка са зламанай нагой і даўняй безнадзейнасцю.

Выбухнула вайна 1914 года. Зноў блізкай здаецца айчына, у якой ёсць «перадышка, адпачынак, цёплае сонца... справядлівасць». Так гавораць яму нацыяналісты, клічучы яго да выгнання аўстрыйскіх і царскіх акупантаў. «Забыліся» яны толькі аб уласным кату Кржысяка, аб пану. А калі, нарэшце, стала фактам «незалежная» Польшча, дык за ўзняўшага галаву селяніна зноў страляе жандар у імя інтарэсаў пана, — жандар з белым арлом на шапцы, якраз з арлом двухгаловым. Позна зразумеў Кржысяк, што яго падманулі пэпэсаўскія дарадчыкі, што трэба было змагацца не толькі супроць цара, але і супроць «уласнага» польскага пана, што трэба было «бабахі пароць віламі, сабачая іх кроў, калоць, з дымам пусціць!» Бо «няма нам месца пад адным небам. Альбо мы, альбо яны».

Памалу маёнтак па-старому прыціснуў грудзі селяніна. Праз трыццаць год «нічога не змянілася», хіба толькі тое, што айчына называлася цяпер Польшчай. Та самая айчына эксплаататараў, толькі з шыльдай, напісанай па-польску.

Аднак, Кржысяк убачыў, што змянілася, калі «глянуў у запаленыя гневам, поўныя нянавісці вочы сына, які падрастаў».

Усё ў «Абліччы дня» і ў «Айчыне» асаблівы тон, пэўная інтанацыя, якія вызначаюць стыль абодвух кніг. Гэта тон страснага доказу, гарачага абвінавачання. Адсюль гарачыя, кароткія фразы. Адсюль нагрувашчанне падобных фактаў. Так гавораць, калі абвінавачваюць. Бо Ванда Васілеўская выступае тут, перш за ўсё, як грамадскі дзеяч. У гэтых першых аповесцях яна вырэзна адчувае самога аўтара за яго герояў; Васілеўская паказвае на іх пальцам, лічыць іх крыўды, заказвае, збірае факты. Яна ні на хвіліну не пакідае сваіх герояў, яна змагаецца за іх, нібы баіцца, што яны самі яшчэ не здолеюць сябе выказаць. Васілеўская ў гэтых аповесцях, перш за ўсё, гарачы палкі трыбун, які гаворыць да сваіх герояў, бо яны самі не ўсё яшчэ гавораць. І ў гэтым сэнсе сама Васілеўская з'яўляецца героем сваіх першых аповесцей.

У «Полымі на багнах» Васілеўская засягнула поўнага аўтарскага аб'ектывізму і адыходзіць у цень, спакойная за сваіх герояў, якія ўжо самі за сябе гавораць; не трэба ўжо бараніць на палях украінскіх сялян, бо ў кніжцы украінская вёска сама сябе бароніць. Рэалістычны паказ рачаіснасці выводзіць на паверхню грамадскія сілы, дзеючыя ва ўкраінскай вёсцы, вызваляе ад неабходнасці ўмешвання ў дзеянні герояў.

Асаднік Жаржыняк, былы сержант польскіх войск, які атрымаў зямлю на Палессі, альбо камендант паліцыі, альбо яго памочнік, Людзік—гэта не спрошчаныя характары, дэманы, якія прыгнятаюць украінскі народ—з д'ябальскай рысай на тварах,—гэта жывыя, поўнакроўныя людзі са сваімі добрымі і злымі рысамі, такія якраз, з якімі прыходзіцца нам змагацца. Збег акалічнасцей кінуў іх сюды ў становішча прадстаўнікоў захопніцкага ўраду і часта, як, напрыклад, Жаржыняк, яны не разумеюць нават сваёй агіднай ролі і з тупой упартасцю змагаюцца з незразумелай для іх пераможнай варожасцю вёскі.

Васілеўская спакойна рысуе іх чалавечыя, асабістыя прагненні і тугу, паказвае, як гэтыя людзі, выконваючы ролю жандармаў польскага імперыялізма, самі пакутуюць і цярпяць. Аднак гэта ні на хвіліну не змазвае іх ролі на жахліва прыгнечанай украінскай зямлі, ні на хвіліну не змяншае іх віны, ні на хвіліну не паслабляе поўнасці таго, што ўкраінская вёска ідзе сваёй дарогай, калі ўсімі спосабамі змагаецца супроць іх. Наогул вобразы сталі толькі больш поўнымі і набліжаюць нас да праўды падзей.

Трагічныя ўцёкі Івана, на якога нападзе паляванне вясёлы памочнік каменданта Людзік, з выключнай маляўнічасцю паказваюць жахлівыя ўмовы, у якіх жылі ўкраінскія сяляне. Іван, які бачыць адзіны ратунак на ўцёках «на Усход», за колькі крокаў ад збавіцельнай граніцы гіне ў багне...

Упарты Людзік, які паляваў троху для спорту, загінуў таксама. Аўтар паказвае яго маці, якая прыехала на пахаванне сына. Вобраз маці, яе перажыванні — праўдзівыя, але гэта праўда сама для сябе, узятая асобна.

З праўдай маці Людзіка скрыжоўваецца праўда Івана, праўда прыгнечанай украінскай вёскі.

Калі чытаеш «Полымя на багнах», адчуваеш, што нешта падобнае ўжо чытаў і праўда, з чымсьці падобным мы сустракаліся ў англійскіх і французскіх пісьменнікаў, пісаўшых на каланіяльныя тэмы. Героі Васілеўскай—асаднік, камендант паліцыі—гэта тыя-ж белыя рэзідэнты ў тропіках. Гэта асацыяцыя пры чытанні твора Васілеўскай сведчыць аб непамыльным разуменні ёю тэмы «красаў».

Палессе было для буржуазнай Польшчы нічым іншым, як польскім Конга. І гэта было тым больш трагічна; што украінскія «негры» сталі на вышэйшай ступені свядомасці, нацыянальнай і грамадскай, чым іх прыгнятальнікі.

Трэба яшчэ сказаць аб прыгожых апісаннях прыроды, якія ёсць шмат у кнізе «Полымя на багнах». Некаторыя, як апісанне жаб'яга канцэрта, зроблены па-майстэрску. У іх проза Васілеўскай набывае музычнае гучанне.

Ад «Аблічча дня» да «Полымя на багнах» талент Ванды Васілеўскай прайшоў цікавую лінію развіцця. Павучальна праследзіць, чым кожная новая кніга Васілеўскай адрозніваецца ад папярэдніх, як кожная яе новая кніга ўзбагачаецца тыпамі, глыбокімі характарамі, маляўнічымі сродкамі, гучнай мелодыкай слова.



Пісьменнікі за работай. Паэт-ордэнаносец **Пятрусь Броўка** напісаў камедыю на калгасную тэму «Заслужаная нагарода», якую будзе ставіць Другі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр. **На здымку:** тав. Броўка ў сваім рабочым кабінеце.

Фота І. Каплінскага.

Партыйнае жыццё

Партыйная арганізацыя мастакоў перад справаздачна-выбарчым сходам

Мудрыя словы правадыра народаў вялікага Сталіна з трыбуны XVIII з'езда ВКП(б) аб задачах трэцяй пяцігодкі, аб ролі савецкай інтэлігенцыі ў будаўніцтве комунізма натхнілі беларускіх мастакоў на дасягненне выдатных творчых поспехаў.

Сведчанне плодатворнай работы мастакоў — стварэнне выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР». Мастацкая грамадскасць Масквы, працоўныя Мінска, сотнямі і тысячамі запаўняўшыя Карцінную галерэю БССР, дзе экспаніраваны скульптуры і карціны беларускіх мастакоў, вельмі цёпла адзываліся аб творах мастакоў-комуністаў Пашкевіча, Грубэ, Азгура, Зайцава, Красоўскага, Гаўрыленкі. У работах гэтых таварышоў, пры наяўнасці асобных недахопаў у іх (незаконачанасць, часам слабасць рысунка), увасоблены мыслі савецкіх мастакоў аб геніях рэволюцыі, аб арганізатарах і кіраўніках перамог сацыялізма. Натхнёныя рашэннямі XVIII з'езда ВКП(б), мастакі-комуністы адыгралі авангардную ролю ў падрыхтоўцы да выстаўкі і па праву занялі на ёй вядучае месца.

І ўсё-ж, адзначаючы ідэйна-творчы рост беларускіх мастакоў, атрыманы імі ў выніку велізарнай дапамогі з боку ЦК КП(б)Б, трэба сказаць, што партыйная арганізацыя Саюза мастакоў БССР не здолела замацаваць вызначыўшыйся ў рабоце ўздым. Сказаліся ў даным выпадку благадушнасць і самазаспакоенасць партарганізацыі, у цэлым, яе сакратара тав. Гаўрыленкі. у прыватнасці.

Знешне нібы ўсё ў парадку. Склікаюцца партыйныя сходы, на якіх абмяркоўваюцца вынікі работы грамадскіх арганізацый саюза за перыяд ад XVIII з'езда ВКП(б). заслухан творчы даклад аднаго з вядучых мастакоў — скульптара тав. Азгура, прымаюцца рашэнні, але ў рабоце партарганізацыі няма асноўнага—**плана і мэтанакіраванасці.** З гэтай прычыны партсходы, як правіла, склікаюцца нечакана для многіх комуністаў, абстаноўка дня загадзя невядома і ў выніку сходы праходзяць вяла, не на патрэбным ўзроўні.

Пры Доме мастака БССР з 15 кастрычніка для мастакоў і архітэктараў працуе лекторый. Наведванне лекторыя добрае. на лекцыі прыходзіць каля 60 чалавек. Мастакі вывучылі 7 раздзелаў «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», праслухалі рад цікавых лекцый аб Рубенсу, Сурыкаву, Врубелю, аб савецкім пейзажы і г. д. З вялікай зацікаўленасцю слухалі нядаўна мастакі даклад прадстаўніка Наркамата меліярацыі, інжынера тав. Сітнікава аб плане асушкі і асваення балотаў. Галоўная вартасць лекторыя ў тым, што ён заахвочвае мастакоў да вучобы, дапамагае ім ва ўзняцці свайго ідэйна-палітычнага і культурнага ўзроўню.

Але аднаго нехапае ў гэтай вялікай справе. Многія з мастакоў абмяжоўваюцца толькі наведваннем лекцый, а самастойна над кнігай не працуюць. Прадстаўнік Варашылаўскага райкома КП(б)Б гор. Мінска тав. Фрадзін, які знаёміўся са становішчам партыйнай прапаганды сярод мастакоў, характарызуе справу самападрыхтоўкі да заняткаў, як «таптанне на месцы». На самой справе, з 10 членаў і кандыдатаў партыі толькі два закончылі вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», самастойна разбіраюцца ў прачытаным матэрыяле, карыстаюцца першакрыніцамі. Астатнія-ж сістэматычна да кніг не звяртаюцца, працуюць урыўкамі. Той факт, што асобныя комуністы ў гутарцы з тав. Фрадзіным не маглі адказаць на самыя элементарныя пытанні, прымушае рабіць вывад аб дрэнным ажыццяўленні ў партарганізацыі Саюза мастакоў БССР гістарычнага рашэння партыі «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды».

Асноўнай прычынай таго, што многія комуністы і беспартыйныя мастакі ў палітычнай падрыхтоўцы «топчуцца на месцы», з'яўляецца адсутнасць якіх-бы там ні было форм кантролю за самападрыхтоўкай. Партарганізацыя не праводзіла нарад з таварышамі, самастойна вывучаючымі «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Не практыкаваліся ёю такія апраўдваючыя сябе метады, як тэарэтычныя субяседванні, ці абмен вопытам таварышоў, вывучаючых асновы марксізма-ленінізма. Сакратар партарганізацыі тав. Гаўрыленка індывідуальных гутарак па тэарэтычных пытаннях з комуністамі не праводзіць.

Партарганізацыя на сваіх сходах мала ставіць пытанні творчага парадку. У творчым калектыве беларускіх мастакоў, як і ў калектывах мастакоў усёй краіны сацыялізма, у наяўнасці розныя напрамкі, рознастайнасць мастацкіх форм. Таму, сяму з мастакоў, з-за іх суб'ектыўных адносін да выяўленчага мастацтва, не па душы гэта рознастайнасць. Партарганізацыя павінна была ўпарта, цярпліва растлумачыць такім мастакам (тт. Керзіну, Бразэру, Тарасікаву і інш.), што толькі ў дружным творчым спаборніцтве розных плыняў, ва ўзаемным іх узбагачэнні закладзен рост савецкага жывапісу, скульптуры, графікі, што могуць існаваць розныя творчыя напрамкі ў адзіным метадзе сацыялістычнага рэалізма.

Партарганізацыі трэба не стаяць у баку ад вялікіх дыскусійных пытанняў мастацтва, а смела, адкрыта ставіць іх на партсходах, на сходах мастакоў, у секцыях, такім шляхам ідэйна і творча выхоўваючы кожнага жывапісца і скульптара.

Вялікім недахопам партарганізацыі Саюза мастакоў БССР з'яўляецца слабая работа па выхаванню кандыдатаў у члены партыі. У тт. Пашкевіча, Грубэ, Азгура, Красоўскага, Берковіч даўно ўжо скончыўся тэрмін кандыдацкага стажу. Але ніхто не збіраў кандыдатаў партыі для азнаямлення з іх работай па вывучэнню гісторыі партыі, таварышы не маюць канкрэтных нагрузак альбо партыйных даручэнняў і ў сэнсе далейшага свайго росту, большэвіцкай закалкі прадастаўлены самім сабе. Нельга цярпець такую роўнадушнасць да справы выхавання кандыдатаў партыі.

Пры Саюзе мастакоў БССР ёсць комсамольская арганізацыя (6 чалавек). Але яна не праяўляе патрэбнай ініцыятывы ў радзе пытанняў. На сходах комсамольскай арганізацыі не ставіліся пытанні творчага парадку. Незразумела, напрыклад, чаму комсамольская арганізацыя на працягу *1940 і пачатку 1941 года ні разу не* абмяркоўвала пытання аб паказе работ маладых мастакоў. Прайшоўшыя зімою лыжныя паходы, разгарнуўшыяся зараз гімнастычныя спаборніцтвы, абаронная работа—усе гэтыя надзённыя пытанні комсамольскага жыцця ніяк не закранулі комсамольскую арганізацыю Саюза мастакоў БССР.

Нядрэнна, што партарганізацыя і праўленне Саюза мастакоў БССР заняліся ў апошні час абароннай справай. Многія мастакі (не толькі комуністы) атрымалі густ да праводзімых кожны аўторак вайсковых заняткаў. Старанна вывучаецца тактыка, матэрыяльная частка зброі. Да выстаўкі «Наша радзіма» больш 30 мастакоў узялі тэмамі сваіх работ пытанні абароны. Але яшчэ не ўся маса мастакоў узялася за тэмы, якія павінны дапамагаць справе ўзняцця мабілізацыйнай гатоўнасці савецкага народа ва ўскладняючайся з кожным днём міжнароднай абстаноўцы. Толькі недастатковай палітыка-выхаваўчай работай можна растлумачыць той факт, што ў творчых заяўках мастакоў амаль адсутнічае такая тэма, як сацыялістычная праца на савецкім прадпрыемстве,—праца, якая ў нашай краіне з'яўляецца справай славы, доблесці і геройства.

У святле рашэнняў XVIII канферэнцыі ВКП(б) можна ўбачыць, што партарганізацыя Саюза мастакоў БССР амаль зусім не займалася такімі пытаннямі, як устанаўленне цвёрдай дысцыпліны сярод мастакоў, арганізацыя іх працы, пытаннямі барацьбы за рэжым эканоміі. Па сутнасці партарганізацыя не ўваходзіла ў пытанні гаспадарчай дзейнасці праўлення саюза, Мастацкага фонда. Рэвізійная камісія Саюза мастакоў БССР (старшыня тав. Бразэр, а член камісіі—кандыдат партыі тав. Азгур) на працягу... шасці месяцаў рэвізуе фінансавую работу саюза і ніяк не можа закончыць сваю работу.

Дрэнна абстаіць справа ў партарганізацыі з праверкай выканання сваіх уласных рашэнняў і рашэнняў вышэйстаячых арганізацый. Гэта адносіцца і да работы праўлення саюза. Для прыкладу, манументальна-дэкарацыйная секцыя ў плане работы намеціла дыспуты па работах тэатральных мастакоў Марыкса, Л. Бродя, Малкіна, Сонкіна, Мільчына. Гэтыя дыспуты не праведзены. Гэта-ж секцыя ўзялася навесці парадак на такім запушчаным участку, як мастацкая прамысловасць, але далей гутарак справа не пайшла. Секцыя скульптараў у плане сваёй работы намеціла сумесную з архітэктарамі нараду па пытаннях рэканструкцыі гор. Мінска, яго афармлення, але і тут далей добрых пажаданняў не пайшлі.

Вядома, у рабоце партарганізацыі Саюза мастакоў БССР ёсць шмат станоўчага. Ён можа падзяліцца сваім вопытам з творчымі арганізацыямі пісьменнікаў, кампазітараў, архітэктараў (лекторый, вайсковыя заняткі, творчыя сустрэчы з мастакамі братніх рэспублік). Але не да твару мастакам, якія маюць несумненныя поспехі ў сваім ідэйна-творчым росце, зазнавацца, супакойвацца на зробленым. Беларускія мастакі рыхтуюцца да наступнага важнага этапу ў сваім творчым жыцці—да Ўсесаюзнай выстаўкі «Наша радзіма» і Ўсебеларускай мастацкай выстаўкі 1942 года, выставак, прысвечаных 25-годдзю Савецкай улады. Задача партарганізацыі Саюза мастакоў БССР заключаецца ў тым, каб рыхтаваць мастакоў да гэтых важнейшых культурна-палітычных мерапрыемстваў. Падрыхтаваць для надыходзячых выставак высокаідэйныя і поўнацэнныя мастацкія творы, вартыя велічнай даты 25-годдзя Вялікага Кастрычніка,—самая *пачэсная задача, якая стаіць зараз перад* кожным мастаком і ў першую чаргу перад кожным членам і кандыдатам партыі. Але для гэтага неабходна, каб пытанні крытыкі ў партарганізацыі мастакоў былі ўзняты на адпаведную вышыню. У гэтай справе мы павінны кіравацца ўказаннем тав. Маленкова, зробленым ім на XVIII партыйнай канферэнцыі: «Чым больш чэсна мы ўскрыем нашы недахопы, тым хутчэй ад іх вызвалімся. Гэтаму штодзённа вучыць нас таварыш Сталін».

Надыходзячы справаздачна-выбарчы сход ускрые сваёй крытыкай недахопы, якія маюць месца ў партарганізацыі, з тым, каб іх рашуча ліквідаваць. Комуністы-мастакі ідуць і будуць ісці на чале ўсяго калектыва мастакоў БССР, па-большэвіцку змагаючыся за ажыццяўленне рашэнняў XVIII канферэнцыі ВКП(б).

І. РУБІНШТЭЙН.

З мінулага нашай літаратуры

Сяргей Палуян

1890—1910

Сяргей Епіфанавіч Палуян нарадзіўся ў 1890 годзе на Піншчыне. У 1909 годзе, поўны сіл і энергіі, творчых планаў і прагнага жадання працы, з'явіўся ён у «Нашу ніву», дзе пачаў весці аддзел «З нашага жыцця». З невядомых для нас прычын, ён у канцы гэтага-ж года быў вымушан пакінуць справу, якой вырашыў афяраваць усё сваё жыццё, і выехаў у Кіеў. Тут ён паступіў у Кіеўскі універсітэт, заняўся згуртаваннем беларускай моладзі, якая тады навучалася ў Кіеве, прапагандай сярод яе ідэй развіцця нацыянальнай культуры; звязаўся з радам украінскіх газет і журналаў, асабліва з журналам «Украінська хата», у якім быў сталым супрацоўнікам. Падобна М. Багдановічу, які амаль усё сваё жыццё правёў за межамі Беларусі, але заўсёды быў у сувязі з ёю, у коле ідэй, хваляваўшых перадавых людзей, Сяргей Палуян падтрымлівае цесную сувязь з «Нашай нівай» і з яе дзеячамі. У аддзел «З нашага жыцця», які ўжо быў даручан другому чалавеку, ён раз-по-раз дасылаў свае артыкулы. Акрамя таго, ён працягваў у «Нашай ніве» пачаты Я. Журбою цыкл «Лісты з Украіны». Пісаў ён вельмі шмат: апавяданні, вершы, драмы для нацыянальнага тэатра, спробы заснавання якога адносяцца да тых часоў, крытычныя і публіцыстычныя артыкулы, нарысы па гісторыі беларускай літаратуры, па гісторыі Беларусі, бібліяграфічныя нататкі і рэцэнзіі. Не ўсе гэтыя рэчы ён закончыў; ёсць цмяныя здагадкі, што шмат яго твораў засталося ненадрукаванымі з-за адсутнасці сродкаў на іх выданне.

Ужо ў 1909 годзе артыкулы С. Палуяна звярнулі на сябе асаблівую ўвагу М Багдановіча. Між імі завязалася ажыўленая перапіска, якая цягнулася да самай смерці Палуяна. Працаваў Палуян выключна многа, не шкадуючы сіл і здароўя. І гэта—пры поўгалодных, поўжабрачых умовах жыцця! Людзі, з якімі Палуяну здаралася сустракацца, і не здагадваліся аб тым, у якіх цяжкіх абставінах знаходзіцца гэты малады чалавек. Уражанне, якое ён пакідаў, гэта — нястомнасць, вялікая энергія, прыгажосць ідэалаў жыцця, для ажыццяўлення якіх ён не шкадаваў нічога. Таму зразумела, што нібы гром з яснага неба прагучала страшная вестка аб яго самагубстве. Гэтага ніхто не чакаў і не мог чакаць, а таму цяжка было паверыць у няшчасную навіну. Здарылася гэта ў ноч на 8 красавіка 1910 года. Але і дасюль не ўстаноўлена прычына самагубства Палуяна.

Некаторае святло на прычыну гэтага праліваецца ў некролагу П. Багацкага, змешчаным у журнале «Українська хата»:

«Яму і не здавалася, што літаратура перастала быць чыстым, здаровым рэчышчам праўды і красы. Што і тут поўна брыдот, што ад вялікага храма Апалона застаўся смярдзючы шынок, прадажная біржа; замест барацьбы за ісціну і красу—барацьба за ўплывы, інтрыгі, рэкламы... І не знесла высокая ідэальнасць усёй мерзасці і задумалася, і ўзняла на сябе руку».

Некалькі слоў аб прозвішчу «С. Палуян». У адным з пісьмаў да М. Багдановіча (ад 14 лютага 1910 г.) Палуян паведамляў: «Паслаў сваю стацяю аб нашай літаратуры ў 1909 г. (у «Нашу ніву»), а яе... перайначылі... і ўрэшце пахвалілі мяне». Артыкул гэты — «Беларуская літаратура ў 1909 годзе»—быў змешчан у № 7 «Нашай нівы» за 1910 год за подпісам «**С. Ясеновіч**». За гэтым-жа подпісам у «Нашай ніве» з'явіўся рад артыкулаў. Гэты момант дасюль нідзе не быў адзначан і мог зрабіцца сур'ёзнай перашкодай у выяўленні літаратурнай дзейнасці нябожчыка. Мы схільны сцвярджаць, што вядомае ў беларускай і украінскай прэсе прозвішча Палуяна ёсць літаратурны псеўданім Ясеновіча, хаця яшчэ далёка ў гэтым не ўпэўнены.

У цыклах публіцыстычных артыкулаў «З нашага жыцця» і «Лісты з Украіны» Палуян выступае ярым паборнікам развіцця беларускай нацыянальнай культуры і літаратуры. Вякамі прыгнечаны народ у выніку рэволюцыйных падзей 1905—06 год абудзіўся ў сваёй нацыянальнай свядомасці і заявіў свае патрабаванні прыгнятальнікам. Так паявілася беларуская прэса ў асобе пакуль што адзінага органа—«Нашай нівы». І Палуян з нумара ў нумар выступае з патрабаваннямі пашырэння беларускага друкаванага слова ў народзе, пашырэння беларускай прэсы, як аднаго з магутных фактараў прапаганды барацьбы за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне. Ён з нумара ў нумар газеты з уласцівым яму запалам, сабранасцю сіл і мэтаімкнёнасцю піша аб неабходнасці ўсебаковага развіцця і ўзбагачэння роднай мовы ў яе формах і лексіцы, лічачы шляхам да гэтага ўсямернае развіццё мастацкай і навуковай літаратуры на ёй.

Але нельга думаць, што ў сваіх публіцыстычных артыкулах ён быў гэткім вузкім дзеячом, які бачыў толькі адну задачу—нацыянальна-культурную работу. Палуян куды шырэй разумеў справу нацыянальна-вызваленчай барацьбы: «...Кожны зразумее, што пры цяперашніх варунках не можа развівацца наша мова, калі ёй няма месца ў жыцці. Заваяваць ёй месца ў грамадзянстве—вось наша першая і неадкладная задача». Само сабою зразумела, што, каб «заваяваць месца ў жыцці» роднай мове, адной нацыянальна-культурнай работы было мала.

Шырока разумеючы праблемы нацыянальна-вызваленчага руху, Палуян ніколі не быў прыхільнікам вузка-нацыянальнай барацьбы, абмежавання работы чыста сваімі, спецыфічна-беларускімі нацыянальнымі інтарэсамі. Для Палуяна нацыянальная справа была адначасова і інтэрнацыянальнай, ён быў прыхільнікам усіх прыгнечаных і абяздоленых народнасцей, усе думкі і імкненні яго былі накіраваны да іх. Ён піша артыкул, поўны спачування да нацыянальнага руху такой, здавалася-б, далёкай народнасці, як якуты — «Якуцкі нацыянальны рух» («Наша ніва», № 43, 1909).

Воляй лёсу трапіўшы на Украіну, Палуян прымае чынны ўдзел у украінскім руху, вывучае яго, пераносіць яго вопыт на Беларусь. Можна сказаць, што ён аднолькава лічыў сябе як беларускім, так і украінскім дзеячом. Ён імкнуўся да аб'еднання сіл беларускага і украінскага нацыянальна-вызваленчага руху і многага ў гэтым дабіўся. «Пры цяперашнім палажэнні нам трудна трываць без шчырых сапраўдных прыхільнікаў між другіх народаў. А для гэтага, канечне, патрэбна кожнаму народу знаёміцца з жыццём і палажэннем нацыянальнай справы другіх. Трэба бліжэй прыглядацца да духоўнага жыцця кожнай нацыі, а гэтае жыццё найбольш адбіваецца ў літаратуры».

Дзякуючы дзейнасці Палуяна, на старонках «Нашай нівы» з'яўляюцца пераклады з лепшых украінскіх пісьменнікаў, у Кіеве ён еднае украінскіх паэтаў. якія перакладалі навейшыя дасягненні беларускай літаратуры на украінскую мову. Асабліва шмат зрабіў у гэтым сэнсе паэт П. Шапавал, чые пераклады змяшчаліся ў журналах «Українська хата» і «Літературно-Науковий Вістник».

Палуян быў адным з сур'ёзнейшых і мацнейшых крытыкаў літаратуры ў «Нашай ніве». Ён надрукаваў толькі адзін крытычны артыкул. Гэта памянёны ўжо агляд «Беларуская літаратура ў 1909 годзе». Але дастаткова і яго, каб убачыць вялікі дар, смеласць і праўдзівасць Палуяна-крытыка. Ніхто з нашаніўскіх крытыкаў не звяртаў увагі на праблему формы беларускага верша. Пальма першынства належыць тут Палуяну. Спыняючыся на творчасці Янкі Купалы, ён асабліва адзначае «лёгкасць і артыстычнасць» форм яго вершаў і тут-жа дадае: «Перад Купалам вялікая будучыня, калі толькі ён не сойдзе з выбранага гасцінца».

Спяг крытыка літаратуры, што вышаў з рук Палуяна, падхапіў блізкі яму па духу М. Багдановіч. Трэба думаць, што пытанні сучаснай літаратуры былі галоўным прадметам перапіскі Палуяна з Багдановічам і што Палуян многа свежых і новых думак выказаў у сваіх пісьмах. Ва ўсякім разе непасрэдным уплывам Палуяна тлумачыцца тое, што пытанні формы займаюць цэнтральнае месца ў літаратурнакрытычных ацэнках Багдановіча. Яны яскрава праявіліся ўжо ў яго цудоўным вопыце «Глыбы і слаі» («Наша ніва», №№ 3, 4, 5, 1911). Нават сам тып артыкула-агляду літаратуры за апошні год Багдановіч успрыняў ад Палуяна.

Палуян праявіў свае выдатныя здольнасці і ў галіне гісторыі літаратуры. Уступ да пачатай ім кнігі па гісторыі беларускай літаратуры ён змясціў у 1910 годзе у «Українській хаті», адкуль відаць, што кніга павінна была называцца «Білоруська поезія в її типових представниках». Палуян паспеў сказаць толькі аб шляхах зараджэння новай беларускай літаратуры ў пачатку XIX стагоддзя — да В. Дуніна-Марцінкевіча.

Як мастак, ён праявіў сябе вершам у прозе «Хрыстос уваскрос» («Наша ніва», №№ 16, 17, 1910) і апавяданнем «Вёска» (з цыкла «Забраны край»—«Наша ніва» № 43, 1910).

Вечна жывым, імклівым і непакорным застаўся Палуян для М. Багдановіча. У сваіх артыкулах Багдановіч шмат разоў з болем і горыччу гаворыць аб яго смерці, але не робіць з гэтага песімістычных вывадаў. Наадварот, ён лічыў, што ў кожным новым дасягненні беларускага руху жыве Палуян. Жыццёвай драме яго аддае Багдановіч увагу ў славутым аглядзе літаратуры «Глыбы і слаі». «Мошна сціснула маладога пісьменніка сучаснае грамадзянскае жыццё, ды не пакарыўся ён яму і за гэта заплаціў сваёй смерцю. Не забудзем-жа яго ў час барацьбы і адлалення, але няхай у нас прабуджаецца разам з тым і святая гордасць: наша пісьменнасць неразвітая і кафавая, але вялікім пачуццём поўніцца ўсё яе цела, не на грашовых справах трымаецца яна і ніколі не пойдзе чысціць боты капіталу!» Вось якія думкі ўсплывалі ў Багдановіча ў сувязі з успамінамі аб Палуяну. «Наша пісьменнасць... ніколі не пойдзе чысціць боты капіталу!» — гэта даказаў сваім кароткім, яркім і прыгожым жыццём Палуян, у гэтым жыццёвасць памяці аб ім.

Дзеячы беларускай літаратуры збудавалі вечны помнік Сяргею Палуяну, прысвяціўшы яму свае бессмяротныя творы. Паэму «Курган» Я. Купала прысвяціў памяці Палуяна. Акрамя двух вершаў. памяці Палуяна Багдановіч афяраваў увесь зборнік «Вянок», на тытульным лісце якога напісана: «Вянок на магілу С. Палуяна (памёр 8 красавіка 1910 г.)».

І. ЛЯНДРЭС.

Творчыя вечары кампазітараў

1. Новая сімфонія Е. Цікоцкага

Е. К. Цікоцкі.

Гісторыя рускага музычнага мастацтва налічвае шмат выдатных твораў, як оперы «Іван Сусанін» Глінкі, «Князь Ігар» Барадзіна, «Сказанне аб градзе Кіцэжы» Рымскага-Корсакава, якія прысвечаны гераічнай гісторыі рускага народа, дзе апяваецца самаадданасць і смеласць тых, хто гінуў у імя радзімы. Гэта вялікая ідэя пранізвае і апладатварае лепшыя творы совецкіх кампазітараў: Шапорына, Пракоф'ева і інш., стварыўшых такія манументальныя творы, як сімфонія-кантата «На полі Куліковым», сімфанічная сюіта «Аляксандр Неўскі», і г. д.

Совецкае мастацтва, закліканае выхоўваць наш народ у комуністычным духу, павінна адыграць зараз выключна важную ролю. Наша краіна ахоплена патрыятычным рухам, імкненнем да ўмацавання нашай абароннай магутнасці, каб у будучых рашаючых баях быць ва ўсеўзбраенні. Таму мастацтва нашых дзён павінна быць насычаным ідэямі гераізму, самаадданай веры ў перамогу комунізма. Наша эпоха патрабуе не суб'ектыўных, псіхалагічна паглыбленых у свой унутраны свет твораў, а твораў, у якіх ёсць прыклады геройства і грамадзянскіх подзвігаў, «якія падымалі-б душу народа і будзілі-б у ёй пачуцці самаадданасці на карысць радзімы», як сказаў у свой час вялікі мастак эпохі французскай буржуазнай рэволюцыі Давід.

У творчасці беларускіх кампазітараў абаронная, гераічная тэматыка займае асобнае месца. Гэта тлумачыцца тым, што наша ордэнаносная рэспубліка з'яўляецца фарпостам соцыялізма на захадзе. Такія творы, як оперы «У пушчах Палесся» Багатырова, «Міхась Падгорны» Цікоцкага, «Як гартавалася сталь» Падкавырава, сімфанічная паэма «Прапагранічніка Лагоду» Аладава, песні Любана, Іванова, Палонскага і іншых кампазітараў, ярка паказваюць небывалы размах гераічнай абароннай тэматыкі. Гэта ўказвае на тое, што нашы кампазітары разумеюць усю адказнасць выхавання чалавечай душы, волі, эмоцый ў духу ўмацавання нашай абароннай магутнасці.

Еўгеній Карлавіч Цікоцкі адзін з тых вядучых кампазітараў Беларусі, у творчасці якога гераічная тэматыка, тэматыка барацьбы, чырвонай ніццю праходзіць праз усе важнейшыя этапныя творы. Адсюль ярка выражаная праграмнасць яго сімфанічных твораў, напрыклад: 1-я сімфонія звязана з тэмай гераічнай барацьбы Чырвонай Арміі з белапалякамі ў перыяд грамадзянскай вайны, сімфанічныя паэмы: «Буравеснік» — з вершам М. Горкага, «Скупы рыцар»—з драмай А. Пушкіна. Праграма новай сімфоніі прысвечана вызваленню Чырвонай Арміяй Заходняй Беларусі ад польскага прыгнёту і з'еднанню беларускага народа.

Кампазітар Е. К. Цікоцкі з'яўляецца буйным майстрам сімфанічнай формы. Ім напісаны дзве сімфоніі, дзве сімфанічныя паэмы і уверцюра «Прывет Маскве» Усе яны выяўляюць у кампазітара добрае веданне формы, аркестра, пачуццё стылю і г. д. З пункту гледжання высокага майстэрства і выражэння мастацкіх ідэй новая сімфонія з'яўляецца найбольш спелым і закончаным творам. Калі у 1-й сімфоніі прыкметны яшчэ знешнія эфекты, агаленыя ўплывы розных стылістычных напрамкаў і г. д., дык у новым творы кампазітар сцвярджае вялікую самастойнасць кампазіцыйных прынцыпаў, хоць уплыў позніх рамантыкаў, Ліста і Вагнера, досыць адчувальны ў ім. Але несумненна, было-б вялікай памылкай выводзіць музыкальны стыль Е. Цікоцкага толькі з засвоеных рамантычных традыцый. Музыкальны стыль новай сімфоніі, перш за ўсё, звязан са стылем папярэдніх твораў кампазітара.

Сімфонія, не зважаючы на тое, што складаецца з чатырох ярка кантрастыруючых частак (алегро, андантэ, скерцо, фінал), робіць вялікае ўражанне сваёй кампактнасцю, сканцэнтрыраванасцю мыслі і адзінствам настрою. Гэтаму ў многім спрыяе матыўна-тэматычнае адзінства частак усёй сімфоніі, матэрыял якой у канчатковым выніку выцякае з тэмы ўступу.

Чатыры часткі сімфоніі можна было-б акрэсліць як асобныя этапы барацьбы за сцвярджэнне асноўнай ідэі: першая частка—героіка-драматычная, другая — «барацьба ў іх», спакойная з адценнем смутку, трэцяя—скерцо, марш —ажыўленая, імклівая, прадчуваючая радаснае лікаванне чацвёртай часткі, і фінал—героіка - трыумфальны: поўная ўрачыстасць ідэі.

Першая частка сімфоніі характарызуецца ўсхваляванай героіка-драматычнай барацьбой за сцвярджэнне ідэй твора (ідэя барацьбы Чырвонай Арміі і з'еднання беларускага народа). Яна ўяўляе з сябе шырока разгорнутае санатна-сімфанічнае алегро, пабудаванае на двух асноўных, ярка кантрастыруючых тэмах. Першая тэма ў до-міноры—волевая, энергічная, з войстра-рытмічным рысункам — з'яўляецца тэмай барацьбы. Другая, пабочная, тэма характарызуецца мяккім лірычным настроем. Яркая і драматычна напружаная распрацоўка заснавана на тэме барацьбы і лейтматыву сімфоніі. У рэпрызе дамініруе пабочная лірычная тэма. Невялікая кода не вырашае зыходу барацьбы і яна прадаўжаецца ў іншых частках сімфоніі.

Другая частка—андантэ—заснавана на шырокай, спакойнай, песеннага характару тэме, звязанай з інтанацыямі і напеўкамі беларускай народнай мелодыі. Інтымна-лірычны характар другой часткі ні ў якой ступені не супярэчыць агульнаму героіка-драматычнаму замыслу сімфоніі і не зніжае яго (аб гэтым сведчаць дзве напружаныя кульмінацыі). Адценне смутку, якое ляжыць на матэрыяле другой часткі, указвае толькі на іншыя цяжкія ўмовы барацьбы («у іх») супроць панскага прыгнёту ў Заходняй Беларусі.

У трэцюю частку—скерцо—кампазітар уклаў шмат выдумкі, вынаходлівасці, таму што выразіцельныя якасці робяць вельмі свежае ўражанне. Напісана скерцо хутчэй у характары імклівага марша. Барацьба прымае тут больш радаснае адценне. Агульны мажорны тонус скерцо-марша, яго імклівы, напорысты і чоткі рытм ва многім нагадвае лікуючы фінал.

Апошняй часткі сімфоніі папярэднічае вялікі патэтычны ўступ, які заснаван на зменены варыянце лейтматыва. У далейшым гэта тэма набывае характар прызыву, заклiку. Фінал з'яўляецца найбольш праграмнай часткай усёй сімфоніі. У ім злучаюцца песенныя тэмы другой часткі, якая набывае тут больш энергічны, рашучы характар, лейтматыўная тэма і ў канцы дадаецца яшчэ фанфарная тэма, узятая з песні «Нам прыслала Масква падкрапленне». (Гэта песня з велізарным поспехам выконвалася на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве).

Фінал мае вялікае абагульняючае значэнне. У ім вырашаецца і заканчваецца тая напружаная драматычная барацьба за таржаство ідэі, за перамогу гераічнага вобраза, якая вялася ў папярэдніх частках сімфоніі. Адсюль тая велізарная і адказная задача, якая выпала на долю фінала. Кампазітар з гэтай вялікай мастацкай ідэяй справіўся добра. Без вонкавага эфекту, без тэатральнасці, але з гераічным пафасам і ўнутраным дастоінствам паказана ў кодзе фінала карціна народнага лікавання ў сувязі з перамогай Чырвонай Арміі, якая нясе вызваленне прыгнечаным народам Заходняй Беларусі. Гэткая філасофская канцэпцыя новай сімфоніі Е. Цікоцкага. У ёй кампазітар выразіў вялікія ідэі нашага часу і ўвасобіў гераічны пафас нашага жыцця.

Ідэя вызвалення Заходняй Беларусі і з'еднання беларускага народа з'яўляецца выключна захапляючай для совецкага кампазітара. Аб гэтым сведчыць маса песень, хораў і сімфанічных твораў Цікоцкага, Столава, Фрэйдзона і інш. Хочацца думаць, што гэта тэма паслужыць матэрыялам і для стварэння музыкальна-драматычнага твора.

Новая сімфонія Е. Цікоцкага не толькі творчая перамога кампазітара, але і вялікае творчае дасягненне ўсёй беларускай музычнай культуры.

2. Справаздачны канцэрт Н. Равенскага

3-га красавіка ў Дзяржаўнай кансерваторыі БССР адбыўся справаздачны вечар-канцэрт кампазітара Н. Я. Равенскага. Кампазітар належыць да ліку тых дзеячоў музычнага мастацтва, якія ўсё сваё свядомае жыццё прысвяцілі збіранню народнай песні, яе апрацоўцы і прапагандзе. Пачынаючы з 1906 года і на працягу 35 год кампазітар запісаў і апрацаваў сотні самых розных па тэматыцы беларускіх народных песень, якія моцна ўвайшлі ў рэпертуар нашых прафесіянальных і самадзейных калектываў.

Н. Я. Равенскі.

Жыццёвы шлях Нікалая Равенскага — гэта шлях радавога працаўніка, які на сваіх плячах вынес увесь цяжар выпрабаванняў этнографа-музыканта, кіраўніка хора ў старой Расіі. Жыццё кідала кампазітара ў розныя куткі Беларусі, але ўсюды, не зважаючы на цяжкія ўмовы, ён аддаваўся любімаму занятку — запісваў народныя песні, знаходзячы ў іх уцеху і радасць.

Нарадзіўся Нікалай Якаўлевіч у 1886 годзе ў беднай сялянскай сям'і. Жабрацкае жыццё прымушае бацьку аддаць сына, які меў добры дзіцячы голас, у царкоўны хор. Хлопчык з 8-мі год, жывучы далёка ад бацькоў, сам зарабляў сабе на пражыццё.

У 18-гадовым узросце, маючы ўжо некаторыя педагагічныя навыкі, Равенскі на працягу некалькіх год працуе ў Мінску і Навагрудку настаўнікам спеваў, вядучы адначасова вялікую работу па запісу народнай песні і кіраванню любіцельскімі харавымі гурткамі. Паспяховыя заняткі па скрыпцы наводзяць яго на думку сур'ёзна заняцца сваёй музычнай асветай, але дрэнныя матэрыяльныя ўмовы не дазваляюць яму ажыццявіць гэтую мару.

Пасля выгнання белапалякаў з Беларусі ў 1920 годзе і з устанаўленнем Совецкай улады Равенскі ўсе свае веды, вопыт і час аддае будаўніцтву беларускай музычнай культуры, асабліва актыўна дапамагаючы рабочай і чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. На працягу двух год (1922—23) работы хормейстрам у Першым Дзяржаўным беларускім драматычным тэатры Равенскі прарабіў значную работу па павышэнню сваёй кампазітарскай тэхнікі. Аб гэтым сведчаць эскізы да аперэты «Залёты» на тэкст Луніна-Марцінкевіча, напісаныя ў клавіры, і зборнік песень, куды ўвайшлі як арыгінальныя творы, так і апрацоўкі народных песень для хора з аркестрам.

У 1923 годзе Наркамасветы БССР пасылае Равенскага вучыцца ў Маскву. Нарэшце ажыццяўляецца яго заветная мара — атрымаць вышэйшую музычную асвету, якой ён марна дабіваўся да Кастрычніцкай рэволюцыі. Не гледзячы на сталы ўзрост (39 год), ён паступае вучыцца студэнтам у Музычнае вучылішча імя Стасава, а ў 1927 годзе ў Маскоўскую кансерваторыю.

Пасля заканчэння музычнай асветы, кампазітар вярнуўся ў Беларусь. У Мінску на працягу васьмі год (1931—1939) кампазітар выкладаў музычна-тэарэтычную дысцыпліну ў Дзяржаўнай кансерваторыі БССР і музычным вучылішчы. Зараз ён працуе метадыстам Цэнтральнага дома народнай творчасці.

Актыўная творчая дзейнасць Равенскага пачалася пасля сканчэння кансерваторыі ў 1931 годзе. Але ўжо ў студэнцкія годы ён піша рад дробных фортэп'янных твораў, песень і кантату для хора, салістаў і аркестра. З 1931 года кампазітар працуе, галоўным чынам, у галіне апрацоўкі народнай песні для хора, але ў апошнія пяць—шэсць год побач з апрацоўкай і гарманізацыяй беларускай народнай песні піша рад твораў для фортэп'яна, сярод якіх мастацкую цікавасць уяўляе пралюдыя і некалькі твораў буйнай формы: струнны квартэт, дзве сюіты для сімфанічнага аркестра, якія выконваліся аркестрам Магілеўскага музычнага вучылішча, кантата для хора, салістаў і аркестра, прысвечаная 15-годдзю вызвалення Беларусі ад белапалякаў, і іншыя.

На справаздачным вечары 3 красавіка быў выкананы струнны квартэт і рад твораў для хора і вакальнага квартэта, у прыватнасці «Ты, чырвоная каліна», «За праснічай», «Чапаеўская» і іншыя. Вечар паказаў, што кампазітар сістэматычна працуе ў галіне апрацоўкі народнай песні і што іменна гэта найбольш моцны бок яго творчасці. У галіне інструментальнай музыкі кампазітару нехапае тэхнікі — майстэрства, ведання формы.

Характарызуючы жыццёвы і творчы шлях кампазітара, трэба ўказаць што за вялікую музычна-грамадскую дзейнасць у гуртках чырвонаармейскай самадзейнасці і за стварэнне раду песень на абаронную тэматыку Н. Я. Равенскі мае пачотныя граматы, падарункі ад часцей Чырвонай Арміі і асабістую падзяку ад таварыша Варашылава.

У сучасны момант кампазітар узяў на сябе абавязак напісаць рад новых твораў, прысвечаных 25-годдзю Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Б. СМОЛЬСКІ.

«Машанька» А. Афінагенава ў пастаноўцы Першага Дзяржаўнага беларускага драматычнага тэатра. Сцэна з III акта. Леанід — артыст Б. Кудраўцаў, Машанька — народная артыстка БССР І. Ждановіч, Акаёмаў—заслужаны артыст БССР С. Бірыла. Фота Э. Острэйкі (БЕЛТА).

„Машанька“

Прэм'ера п'есы А. Афінагенава ў Першым Дзяржаўным ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга беларускім драматычным тэатры

Многа напісана мастацкіх кніг, п'ес аб узаемаадносінах бацькоў і дзяцей. Парознаму класікі літаратуры вырашалі гэту праблему. Імі створаны мастацкія каштоўнасці, якія дапамагаюць нам у новых умовах зусім па-новаму вырашаць гэту праблему. Совецкія драматургі ўжо напісалі і прадаўжаюць пісаць новыя п'есы аб складаных пытаннях совецкай сям'і, быту, узаемаадносін людзей.

«Машанька» А. Афінагенава — спроба ў нейкай меры вырашыць праблему, ці хоць частку яе, аб узаемаадносінах бацькоў і дзяцей. Недахоп толькі ў тым, што, як нам здаецца, правільна разумеючы патрабаванні нашага часу, драматург «пастарынцы» будуе калізіі, нячотка акрэслівае свае погляды. У п'есе прыкметны падабенствы, ці як кажуць пра паэзію, перапевы. А гэта прыводзіць да зніжэння арыгінальнасці, хоць «Машанька» па сваёй тэме — п'еса патрэбная і карысная.

У чым-жа сутнасць п'есы «Машанька»? 15-гадовая дзяўчынка, робкая і нясмелая, ідзе ад сваёй маці да дзеда — вучонага. Яе халодна сустракае акадэмік Акаёмаў. Ён не прывык «вазіцца» з дзецьмі, ды і прысутнасць Машанькі, як ён думае, будзе перашкаджаць яго працы. Вынік такі, што Машанька ўсё-ж жыве ў доме вучонага, расце, развіваецца, радуе старога вучонага.

І вось на сцэне другая, прадугледжаная драматургам інтрыга. У дом прыходзіць маці Машанькі — Вера Міхайлаўна. Яна хоча забраць дачку з сабой. Раней яна адпусціла яе, бо ў гэтым бачыла асабісты спакой свайго жыцця з новым мужам (бацька Машы, сын Акаёмава, памёр). Цяпер-жа, калі ў яе зноў сямейныя нелады, калі яна засталася адна, яе адзіная надзея —Машанька. Але Маша хоча жыць у дзеда. Вера Міхайлаўна, раней абражаная Акаёмавым, вырашае цяпер адпомсціць яму — адабраць любімую ўнучку. І тут зноў знаёмы вынік: мір і лады ўстанаўляюцца, спачатку ўсе крыху пасумавалі, а пасля таржаствуюць.

Пры ўсёй гэтай нескладанасці драматургічнага матэрыялу, ёсць усё-ж у п'есе мыслі аб праблеме бацькоў і дзяцей. Аднак гэтыя мыслі, як пэўныя каштоўнасці, параскіданы па ўсёй п'есе. Яны ледзь улавімы. І тут тэатру і, у прыватнасці, рэжысёру Е. Н. Саннікаву, ажыццявіўшаму пастаноўку «Машанькі», давялося праявіць выключны такт, асцярожнасць, каб захаваць гэтыя каштоўнасці, данесці іх да гледача, падкрэсліць. Мне здаецца, што тэатру гэта ўдалося дасягнуць. Добрая мысль Акаёмава (які ўрэшце прызнаецца ў сваім няведанні сям'і) і яго меркаванні па пытаннях сям'і, выхавання дзяцей даходзяць да гледача, прымушаюць спытацца: «а як у нас» і падумаць глыбока і ўсебакова.

Хай у радзе месц гэта мастацка не зусім пераканаўча зроблена, але знойдзеныя каштоўнасці не загубяцца: як быць, як паступаць, як-бы я паступіў — усе гэтыя пытанні будуць вырашацца пасля спектакля. Глядач разумее, што бацькі не могуць быць абыякавымі ў адносінах да сваіх дзяцей, іх прамы абавязак — выхоўваць дзіця, але выхоўваць не аднаму, а з калектывам. У гэтым сіла драматургічнай мыслі, яе правапавучальная функцыя.

У спектаклі ёсць добрыя мізансцэны, рэжысёрскія знаходкі. Адчуваецца, што рэжысёр падышоў да п'есы асцярожна і ўдумліва. І хоць ён занава драматургічны твор не перарабляў, аднак зрабіў спектакль, які па сутнасці розніцца ад п'есы. Спектакль атрымаўся культурны, бо ён вырашан па-свойму, а, значыць, і гучанне патрэбных матываў п'есы стала больш чоткае і выразнае.

Узровень акторскага выканання бясспрэчна вышэй за драматургічныя якасці п'есы. Інакш-бы не магло атрымацца спектакля, маючага права на існаванне.

Народная артыстка БССР І. Ждановіч — выканальніца ролі Машанькі, узяла ад п'есы ўсё, як кажуць, да каліва. Нядаўна мы бачылі яе ў ролі гордай іспанкі ў «Фламіры». Зараз яна 15-гадовая дзяўчынка. Цудоўнае пераўвасабленне! Ждановіч стварае вобраз дзяўчынкі лірычна цёплы, пранікнёны. Яе Машанька па-дзіцячаму простая, наіўная і сталая ў меркаваннях. Яна ўжо ўсё разумее. Раз памыліўшыся, яна больш не паўторыць памылкі, раз даведаўшыся, яна не забудзе аб гэтым. Вобраз дзіцяці поўны летуценных мараў аб жыцці прыгожым і карысным, — такая Машанька ў трактоўцы Ірыны Ждановіч.

Акаёмава добра іграе заслужаны артыст БССР С. Бірыла. Цяжкі і складаны гэты вобраз. У радзе месц актор выдатна спраўляецца са сваёй роллю. Аднак, хочацца адзначыць, што асобныя месцы Бірыла праводзіць няроўна. Не хочацца згадзіцца з залішне падкрэсленай чорствасцю, а ў радзе месц меладраматычнай слязлівасцю, якія, мне здаецца, перашкаджаюць успрыняццю ўвогуле правільна акрэсленага акторам вобраза. Актор павінен далей ісці па намечанаму ім шляху некаторага нарачытага адхілення ад тэксту і большага ачалавечвання вобліка Акаёмава.

Добра іграе Б. Кудраўцаў: лёгка, непрымусова, непасрэдна. Яго геолаг Леанід слаўны і прывабны чалавек. Але і толькі. Што-ж датычыць паказу якасцей Леаніда — геолага, вучонага, блізкага к Акаёмаву, дык гэта, нажаль, у вобразе, створаным Кудраўцавым, чамусьці не падкрэслена. Мы любім вясёлых, добрых людзей. Але і праз іх весялосць, праз іх дабрату мы пазнаём і павінны пазнаваць людзей усебакова, усебакова ведаць іх станоўчыя і адмоўныя якасці. Гэты прабел Кудраўцаву трэба як мага хутчэй запоўніць і тады яго Леанід стане поўным, яшчэ больш успрыймальным.

Настаўніцу музыкі Ніну Аляксандраўну нядрэнна іграе заслужаная артыстка БССР Р. Кашэльнікава, а Веру Міхайлаўну — заслужаная артыстка БССР Л. Ржэцкая. Ржэцкая ўжо ў першым спектаклі знаходзіць драматычныя ноткі ў сваёй ігры. Трэба толькі іх узмацніць і невялікі вобраз будзе больш значным у спектаклі.

Прыемна старушка Моця ў выкананні заслужанай артысткі БССР Е. Міронавай. Моця ўносіць у спектакль атмасферу цеплыні, акуратнасці, прыязні і чалавечай дастойнасці.

Ёсць у п'есе і так-званыя адмоўныя персанажы, функцыя якіх, па замыслу драматурга, заключалася ў тым, каб шляхам кантрасту больш выразна падкрэсліць станоўчае. Гэта доктар Туманскі і яго сын Віктар. Адмоўнасць іх у дрэнных паводзінах, выкліканых неразумнымі поглядамі. А погляды Туманскага антымаральныя, пошлыя. І сына свайго ён так выхоўвае. Той гатоў жыць толькі сёнешнім днём, бесклапотна ставіцца да сваёй будучыні, чэсці, чалавечай годнасці. Аднак у п'есе гэтыя вобразы вельмі слаба нарысаваны. Заслужаны артыст рэспублікі Быліч зрабіў усё магчымае, каб вобраз жыў на сцэне, але Туманскі застаўся ў цені. Віктар-жа, у пачатку добра ахарактарызаваны, пасля паказан вельмі шаблонна, непераканаўча. Дзіўна нават, што гэты дрэнны хлопец літаральна за некалькі гадзін становіцца выхаваным і прысутнічае ў добрым доме Акаёмавых.

Гэтыя і іншыя, больш дробныя, недахопы п'есы ўплываюць на якасць спектакля і ў радзе месц даўлеюць над ім.

Спектакль стрымана аформлен мастаком С. Дабжынскім. Асобна хочацца адзначыць афармленне кабінета Акаёмава, які просты і натуральны, сугучны падзеям, якія ў ім адбываюцца. Мастака можна папракнуць за аднастайнасць у афармленні іншых сцэн.

«Машанька» — спектакль, які будуць глядзець нашы гледачы, выносячы з яго многа карыснага для сябе. Але «Машанька» яшчэ не тое, што хацелася-б бачыць у такім спектаклі. Мала ў п'есе, а таму і ў спектаклі таго новага, што змяшчае ў сабе наш час.

П. ВІХРОЎ.

M. Модэль

Пытанні тэатразнаўства

Беларускі прафесіянальны тэатр існуе больш дваццаці год. Гэта значыць, што ён мае ўжо сваю гісторыю, якую трэба дасканала вывучыць. Шмат надзённых творчых пытанняў узнікае ў практыцы тэатраў. Рэжысёраў і актораў хвалюе праблема тэатральнасці. Дыскусію ў друку і ў саміх творчых калектывах выклікалі спектаклі «Дура для іншых—разумная для сябе», «Фландрыя», «Кадлуння», «Марная перасцярога», «Сантыментальны вальс». Асобныя з гэтых спектакляў знайшлі ў крытыцы розныя ацэнкі. У абмеркаванні гэтых спектакляў узніклі такія творчыя пытанні, як стыль, манера ігры, разуменне народнасці.

Асабліва гарачыя спрэчкі ўзнікаюць навакол кожнага новага спектакля на совецкую таму. У цэнтры гутарак тут звычайна бывае праблема стварэння вобраза совецкага чалавека—станоўчага героя.

Багаты і рознастайны вопыт беларускага совецкага тэатра патрабуе тэарэтычнага абагульнення. Настаў час стварэння гісторыі беларускага тэатра. Па ініцыятыве маскоўскага выдавецтва «Искусство», напісанне нарысаў па гісторыі беларускага тэатра было пачата яшчэ ў мінулым годзе—перад дэкадай беларускага мастацтва ў Маскве. Быў створан аўтарскі калектыў у складзе драматургаў В. Вольскага, Е. Рамановіча, фальклярыста М. Грынблата, музыказнаўца Б. Смольскага, мастака Б. Малкіна, крытыкаў А. Кучара, Г. Бярозкіна, І. Дорскага і аўтара гэтых радкоў, якія і напісалі першы варыянт нарысаў.

Аднак спешка, з якой ствараліся нарысы, адмоўна сказалася на іх тэарэтычным узроўні. Узнікла неабходнасць ґрунтоўнай дапрацоўкі ўжо напісаных работ, якая зараз вядзецца пры ўдзеле новых членаў аўтарскага калектыва—т.т. Гершэнзона і Нефёда. Нарысы складаюцца з наступных артыкулаў: ля вытокаў прафесіянальнага тэатра (Грынблат), беларуская драматургія (Бярозкін, Кучар, Модэль), Першы Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр (Рамановіч), Другі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр (Вольскі і Дорскі), Тэатр оперы і балета БССР (Модэль і Смольскі), Тэатр юнага гледача і абласныя тэатры (Гершэнзон і Нефёд) і тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва (Малкін).

Аўтары нарысаў упершыню сабралі і апрацавалі найбольш значныя факты з гісторыі беларускага тэатра, асабліва за совецкі перыяд. У большай меры гэта ўдалося зрабіць у артыкулах т.т. Грынблата, Вольскага, у артыкуле аб оперна-балетным тэатры, у меншай меры ў іншых артыкулах.

Загана нарысаў у тым, што яны напісаны без неабходнай сувязі з гісторыяй Беларусі. Вядома, што тэатр развіваўся не ізаліравана ад класавай барацьбы і гісторыі народа, а што гісторыя тэатра ёсць частка гісторыі народа.

Нельга, зразумела, механічна падзяліць гісторыю тэатра на этапы, якія праходзіла гісторыя народа, аднак узаемасувязь паміж адным і другім існуе.

Гісторыя беларускага тэатра— арганічная частка гісторыі ўсяго совецкага тэатра. У асобных-жа нарысах не асветлены творчыя сувязі беларускага тэатра з рускім тэатрам і мастацкай культурай братніх рэспублік. Добра вядома, што беларуская совецкая драматургія стваралася не ізаліравана ад братніх літаратур, а ў творчым супрацоўніцтве з імі, у прыватнасці з рускай і украінскай совецкай драматургіяй, што такія п'есы, як «Любоў Яравая» К. Трэнёва, «Разлом» Б. Лаўрэнёва, «Бранепоезд» В. Іванава і «Мяцеж» Д. Фурманава, як і «Гібель эскадры» Карнейчука, мелі станоўчы ўплыў на работу беларускіх драматургаў.

На гісторыі беларускіх драматычных тэатраў можна прасачыць барацьбу розных плыняў, якая ў той ці іншай меры адбывалася і ў тэатральным мастацтве братніх рэспублік. Беларускі тэатр вёў барацьбу з фармалізмам, які пранік у яго асобныя спектаклі («Жакерыя» па Мерымэ і інш.). На тэатр наступалі буржуазныя нацыяналісты, якія засмечвалі рэпертуар варожымі творамі. У сваіх артыкулах яны ахайвалі рускую рэволюцыйную драматургію, якая ставілася на сцэне Першага драмтэатра. Творчыя калектывы нашых тэатраў, з дапамогай большэвіцкага друку, выкрылі і разграмілі нацыянал-дэмакратызм у мастацтве і крытыцы.

Розныя вульгарызатары «крытыкавалі» тэатр за яго работу над беларускім фальклорам, залічаючы ўвесь беларускі фальклор у нацыяналістычны. Такі лёс пасціг надзвычай цікавы фальклорны спектакль «Машэка» (БДТ-І).

У артыкуле аб Першым Дзяржаўным ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга беларускім драматычным тэатры барацьба з варожымі ўплывамі і работа па стварэнню беларускага соцыялістычнага тэатра павінна знайсці ўсебаковае адлюстраванне.

Аналагічныя працэсы адбываліся і ў гісторыі Другога Дзяржаўнага беларускага драматычнага тэатра.

Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР, развіваючыся самастойным мастацкім шляхам, таксама адчуваў карысныя ўплывы рускай опернабалетнай культуры і музыкальнай культуры братніх рэспублік. Несумненна, што першыя беларускія совецкія оперы, апрача нацыянальных асаблівасцей, маюць і некаторыя агульныя рысы з операмі Дзержынскага, Хрэннікава, грузінскіх і армянскіх совецкіх кампазітараў. У фарміраванні творчых кадраў нашага Опернага тэатра значную ролю адыгралі Музыкальны тэатр імя Неміровіча-Данчэнка, Ленінградскае хорэаграфічнае вучылішча. Бясспрэчны заслугі ў гэтай галіне рэжысёра П. Златагорава, майстроў танца Ф. Лапухова, З. Васільевай, А. Ермалаева і маскоўскіх мастакоў—Волкава, Нікалаева і Матруніна. Прасачыць узаемасувязь совецкай оперна-балетнай культуры надзвычай важная задача аўтараў артыкула аб оперна-балетным тэатры.

У нарысах адсутнічае глыбокі аналіз усяго новага, што прынесла ў беларускі тэатр соцыялістычная рэволюцыя. Недастаткова асветлен той факт, што развіццё нашага тэатра з'яўляецца вынікам фарміравання новага совецкага грамадства, новай соцыялістычнай культуры. Калі чытаеш артыкулы некаторых таварышоў, ствараецца думка, што гісторыя тэатра нібы толькі вынік эвалюцыі светапогляду асобных рэжысёраў і артыстаў.

Агульнавядома сусветнае значэнне сістэмы К. С. Станіслаўскага, якая апладатварыла і беларускі совецкі тэатр. Аднак, з артыкулаў па гісторыі беларускага тэатра не відаць канкрэтнага ўздзейнічання «сістэмы» на майстэрства нашых асобных актораў. Акторы і створаныя імі вобразы не знайшлі належнага месца ў нарысах. Драматургі, кампазітары і рэжысёры ў асобных артыкулах выцеснілі актораў.

Агульнае ўяўленне ў нарысах можна атрымаць толькі аб некаторых найбольш выдатных беларускіх акторах—Л. Александроўскай, Г. Глебаву, Р. Млодэк, В. Уладамірскім, А. Ільінскім, П. Малчанаву. А многія значныя акторы і таленавітая тэатральная моладзь выпалі з поля зроку аўтараў нарысаў па гісторыі беларускага тэатра.

Стварэнне гісторыі беларускага тэатра справа нялёгкая. У БССР яшчэ няма дастаткова вопытных даследчыкаў-тэатразнаўцаў, ёсць толькі невялікая група крытыкаў, якая да гэтага часу абмяжоўвала сябе пісаннем рэцэнзій і журнальных артыкулаў. Але гэтыя сілы яшчэ як след не аб'еднаны. Незразумела, чаму пры Інстытуце літаратуры Акадэміі навук БССР дасюль не створан тэатразнаўчы сектар. Архівы пры тэатрах (рэцэнзіі і іншы крытычны матэрыял, фота, эскізы касцюмаў, дэкарацый і г. д.) з'яўляюцца багатым матэрыялам для музеяў. Трэба вітаць ініцыятыву дырэкцыі Опернага тэатра, якая 12 красавіка адкрывае— першы ў БССР— тэатральны музей.

На нарадзе актыва работнікаў мастацтваў, якая праходзіла ў сакавіку гэтага года ў Маскве, начальнік украінскага Упраўлення па справах мастацтваў узняў пытанне аб арганізацыі ў іх рэспубліканскага тэатральнага таварыства, у якасці філіяла ВТО. У мінулым годзе такое-ж пытанне ўзнімалася і на нарадзе актыва работнікаў мастацтваў БССР. Нам здаецца, што прыйшоў час арганізацыі і беларускага тэатральнага таварыства, якое павінна займацца як вывучэннем гісторыі беларускага тэатра, так і надзённымі творчымі пытаннямі, якія пастаянна ўзнікаюць у практыцы кожнага рэжысёра, актора, драматурга і работніка музыкальнага тэатра.

Арганізацыя тэатральных музеяў і беларускага тэатральнага таварыства—філіяла ВТО—залежыць **выключна** ад Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР. Да яго мы і звяртаемся. Напісанне навуковай гісторыі беларускага тэатра ў значнай меры залежыць і ад вырашэння гэтых арганізацыйных спраў.

Нарысы па гісторыі беларускага тэатра, якія пішуцца зараз, з'яўляюцца толькі першым вопытам у гэтай галіне. Мы спадзяёмся, што за гэтым пачнецца работа па стварэнню ґрунтоўнай, навуковай гісторыі беларускага тэатра.

Бібліяграфія

„Новыя гарызонты“

Першы нумар польскага літаратурна-грамадскага штомесячніка.

Вышаў першы нумар польскага літаратурнага журнала «Новыя гарызонты» пад рэдакцыяй Ванды Васілеўскай.

Гэта яшчэ адна перамога сталінскай нацыянальнай палітыкі, якая забяспечвае ўсім народам, насяляючым Савецкі Саюз, магчымасць развіцця нацыянальнай культуры. Памятаем, як праследвалася ў капіталістычнай Польшчы выданне незалежных журналаў і газет на мовах насяляўшых Польшчу нацменшасцей; памятаем, якім рэпрэсіям падлягалі выдаўцы і працаўнікі левых органаў друку на польскай мове, памятаем, як праследваліся, арыштоўваліся супрацоўнікі гэтых выданняў. Незалежныя літаратурныя выданні, як «Левар» («Падважнік») і «Папросту», былі «папросту» закрыты. «Закрыты» былі і іх рэдакцыі.

У Савецкім Саюзе друк служыць грамадству, як і літаратура, ён мае багатыя магчымасці для свайго развіцця і росту.

Пасля польска-нямецкай вайны на тэрыторыі вызваленых Чырвонай Арміяй абласцей Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны апынулася багата палякаў, працаўнікоў культуры і мастацтва. Арганізаваны польскія тэатры, шмат польскіх пісьменнікаў улілося ў рады Саюза савецкіх пісьменнікаў, шмат працуе палякаў — навуковых працаўнікоў, даючы свой уклад у савецкую культуру. Усіх іх заклікаў ва ўступным артыкуле журнал «Новыя гарызонты» ствараць новую польскую культуру — частку савецкай культуры, групіравацца вакол журнала, каб працаваць для развіцця польскай мовы, польскай паэзіі, польскага мастацтва.

Вельмі добра зрабіла рэдакцыя, змясціўшы ва ўступе прамову таварыша Сталіна «На смерць Леніна». Прамова гэта, сказаная ў 1924 годзе, паказвае шлях на многія годы, яна заўсёды актуальна гучыць для кожнага савецкага грамадзяніна.

Журнал дае досыць разнастайны арыгінальны матэрыял. Нам здаецца, было-б мэтазгодным змяшчаць у ім і пераклады лепшых твораў савецкай літаратуры — рускай і іншых братніх народаў.

У раздзеле паэзіі журнал змясціў вершы львоўскіх паэтаў Ю. Путрамента, М. Яструна, Ю. Пшыбася, А. Важыка, Сусанны Гінчанкі, П. Кожуха. Вельмі ўдалы верш Ю. Путрамента «Захад», прысвечаны імперыялістычнай вайне. Верш заканчваецца гнеўнымі словамі па адрасу падпальшчыкаў вайны, якіх чакае народная помста. Яскравыя вобразы вайны малюе ў сваім белым вершы «Успамін» і М. Яструн. Блізкі да гэтай тэмы і верш Ю. Пшыбася «У бегстве», — глыбокія перажыванні з часу вайны яшчэ вельмі моцны ў свядомасці паэтаў, каб ад іх можна было адразу вызваліцца.

Але ёсць у нумары і вершы, прысвечаныя новай тэматыцы, савецкай рэчаіснасці. Паэт А. Важык у вершы «Савецкая радасць» заклікае «здабываць з вугальнай скалы чорныя калоры слоў», каб у іх агні «разагрэтую да чырвонасці гісторыю перакаваць у песню сталінскай эпохі». Аб «Прабуджэнні» пасля світання, дзе «у чырвоным бляску пажараў ідзе вайна», гаворыць у сваім вершы С. Гінчанка.

Проза ў журнале прадстаўлена творамі А. Рудніцкага, Галіны Гурскай, Бланкі Збышэўскай і Елены Сэльм.

Апавяданне А. Рудніцкага «Юзефаў» рысуе мужную постаць комуніста, палітычнага вязня, які паміpae з думкай аб братах-рабочых, што змагаюцца за свабоду Іспаніі. Цікавыя матэрыялы да аповесці Г. Гурскай. «Апошні дзень вайны» Б. Збышэўскай паказвае жудасныя сцэны ў «сховішчы»—склепе ў часе паветранай бамбардыроўкі. Апавяданне Елены Сэльм «Грудная жаба», у якім выведзена сям'я, што пакутуе ад беспрацоўя ва ўмовах капіталістычнага ладу, стварае моцнае ўражанне, асабліва ў раздзелах пра хваробу маці.

Драматургія прадстаўлена фрагментам п'есы Ванды Васілеўскай «Аповесць пра Бартоша Главацкага». Шкада, што твор не надрукаван цалкам, асабліва, калі ўлічыць недахоп сцэнічных твораў для польскіх самадзейных гурткоў.

Аддзел літаратуры замыкае артыкул Бой-Зяленскага «Старыя і новыя шляхі навукі аб Міцкевічу» і старанна апрацаваныя водгукі на міцкевічаўскія ўрачыстасці ва ўсёй нашай краіне. Падсумоўваючы вядомыя дагэтуль весткі пра Міцкевіча, Бой-Зяленскі прыходзіць да вываду, што «Міцкевіч належыць хутчэй да тых, аб якіх навука найменш поўная». У Савецкім Саюзе ёсць усе магчымасці папоўніць веды аб Міцкевічу, акрэсліць сапраўднае яго аблічча, скажонае буржуазна-памешчыцкай «навукай».

У аддзеле крытыкі «Агляд савецкай літаратуры» дае весткі аб радзе пісьменнікаў, аб іх творах, паказвае ролю і задачы савецкага пісьменніка. Журнал змясціў рад крытычных разбораў падручнікаў, выдадзеных для польскіх школ.

Вельмі актуальны і змястоўны артыкул «Руская дэмакратыя аб паўстанні 1863 года». Хроніка дае багаты агляд польскіх літаратараў у СССР.

Увогуле першы нумар журнала «Новыя гарызонты» стаіць на высокім узроўні. Журнал мае ўсе даныя для таго, каб выканаць сваю задачу—«служыць польскай культуры, як часцы савецкай культуры».

Ю. РАВІЧ.

«Прадзелкі Скапена» Мальера ў тэатрах БССР. Злева — сцэна спектакля ў Тэатры юнага гледача БССР: Скапен — арт. **А. Матусевіч.** Жаронт — арт. **Л. Фрыдман.** Уверсе — сцэна спектакля ў Пінскім абласным драматычным тэатры: Леандр — арт. **Дашкоўскі,** Октаў — арт. **Шматовіч,** Скапен — арт. **Ефрэменка.**

Аб перакладах п'ес

Задача тэатраў—узбагаціць свой рэпертуар ідэйна і мастацка поўнацэннымі савецкімі п'есамі, выхоўваючымі ў гледача пачуццё любві да соцыялістычнай радзімы, пачуццё патрыятызму і гордасці за савецкага чалавека — будаўніка комуністычнага грамадства. Адпаведнае месца павінна заняць і класіка—руская і заходнееўрапейская.

Але ўключэнне ў рэпертуар добрай п'есы—толькі пачатак работы. Трэба гэту п'есу добра данесці да гледача. Гаворачы аб якасці, аб рабоце тэатра над пастаноўкай п'ес, увагу ўсіх тэатраў БССР трэба перш за ўсё звярнуць на неабходнасць больш дзейснай барацьбы за культуру мовы.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на якасць перакладу п'ес савецкай драматургіі і класікі на беларускую мову. Гэту задачу правільна зразумелі Першы і Другі Дзяржаўныя беларускія драматычныя тэатры і Тэатр юнага гледача. Большасць перакладаў у гэтых тэатрах робяць кваліфіцыраваныя перакладчыкі, беларускія пісьменнікі. Гэта забяспечвае высокі ідэйна-мастацкі ўзровень перакладаў. Гэткі, напрыклад, пераклад п'есы Н. Пагодзіна «Крэмлёўскія куранты», зроблены К. Чорным для Другога Дзяржаўнага беларускага драматычнага тэатра. «Чырвоная шапачка» Шварца ў перакладзе З. Бядулі для Тэатра юнага гледача не толькі не страціла сваёй вартасці, але набыла нават новыя мастацкія якасці. Гэткія-ж пераклады п'ес, зробленыя К. Крапівой і В. Вольскім.

Але нажаль, і ў гэтых, вядучых, тэатрах культура слова, культура перакладу п'ес не заўсёды высокая. Асабліва-ж дрэнна абстаіць справа перакладу п'ес у абласных і калгасна-саўгасных тэатрах. Праверка, зробленая Рэперткомам БССР, паказала, што большасць гэтых тэатраў не аддае перакладам адпаведнай увагі, лічачы гэта, відавочна, чыста тэхнічнай справай. Пераклады даручаюцца людзям мала кваліфіцыраваным, не звязаным з тэатрам, не ведаючым яго спецыфікі, а часта не ведаючым і літаратурнай беларускай мовы, у выніку чаго пераклад зніжае ідэйна-мастацкі ўзровень арыгіналу.

Можна прывесці прыклад таго, калі ў пагоні за даслоўнасцю перакладчыкі робяць не мастацкі пераклад, а рамесленіцкі падрадкоўнік, які нярэдка скажае сэнс твора. Напрыклад, тав. Сабаленка, перакладаючы камедыю Шэкспіра «Мера за меру» для Палескага абласнога драмтэатра, фразу «Джульетта стонет і разрешенья ждет» (г. зн. родаў) перакладае так: «Стогне, чакаючы дазволу» Альбо «охолостить всех мужчын» перакладае: «зрабіць усіх нежанатымі» і г. д.

Шмат скажэнняў знойдзена ў перакладзе камедыі Мальера «Плутні Скапена» (Пінскі абласны тэатр). Перакладчык тав. Кір'янаў зрабіў яго амаль даслоўна, але без патрэбнага ведання літаратурнай беларускай мовы. У некаторых месцах, відавочна, не ведаючы, як перакласці тую ці іншую фразу, перакладчык перарабіў тэкст такім чынам, што ён страціў свой першапачатковы сэнс. Напрыклад, фразу: «Мне хотелось лично вручить ему деньги» тав. Кір'янаў пераклаў: «Мне дужа хацелася самому бачыць, як я буду аддаваць грошы». Фраза: «что поделывают наши друзья» перакладзена: «што парабляе наш народзец». Ці яшчэ: «вознаграждаю рассказчика своим смехом» перакладзена: «узнагароджваю расказчыка той асалодай, якую ён мне дастаўляе», і шмат таму падобнага.

Недастаткова кваліфіцыраваныя перакладчыкі не ўзбагачаюць беларускую мову, а засмечваюць яе старымі, даўно аджыўшымі словамі. Гэта, напрыклад, уласціва перакладу п'есы «Няроўны шлюб», зробленаму для Бабруйскага калгаснага тэатра тав. Зенчыкам.

Не ведаючы мовы і не ўмеючы знайсці адэкватныя беларускія словы, якія могуць поўна выразіць мысль аўтара твора, некаторыя перакладчыкі ўпадаюць у іншую крайнасць—проста пішуць рускія словы, толькі ў беларускай транскрыпцыі, альбо ўжываюць звароты гутаркі, не ўласцівыя беларускай мове, чым абядняюць беларускую мову. Асабліва ярка праявілася гэта ў тав. Траецкага пры перакладзе камедыі Гальдоні «Тракціршчыца» для Лепельскага калгаснага тэатра, які дапусціў такія словы, як: «мысляшчы», «вобмарак», «мсціць» і г. д. Не лепш перакладзены п'есы «Сын народа» і «Сынішка» у гэтым-жа тэатры. Перакладчыкі тт. Пятрашка і Цімафееў дапусцілі ў перакладах шмат скажэнняў. Напрыклад: «спрятать замешательство» перакладзена: «захаваць збянтэжанасць». Альбо такая фраза: «зачыніў твар рукамі», нібы твар можна «зачыніць», як дзверы альбо акно.

Пры перакладзе п'есы «Настаўнік» для Дзяржынскага калгаснага тэатра перакладчык тав. Алісевіч у пагоні за даслоўнасцю пераклаў словы «учебные пособия», як «падручныя дапаможнікі», «имею в виду», як «маю ў выглядзе». Такіх прыкладаў можна прывесці шмат.

Гэтыя факты паказваюць, што з перакладам п'ес справа ў нас абстаіць яўна дрэнна. Нельга ў далейшым дапускаць такое становішча, калі беларуская мова скажаецца кім заўгодна і як заўгодна. Нашы тэатры з'яўляюцца праваднікамі культуры ў шырокія масы працоўных, і са сцэн тэатраў павінна гучаць добрая літаратурная беларуская мова.

Кіраўнікі тэатраў павінны зразумець, што перакладчык—не апошні работнік у тэатры. Трэба ўзняць на адпаведную вышыню і значэнне работы перакладчыка, і патрабаванні да перакладчыка, як да творчага работніка, які павінен майстэрскім перакладам поўнасцю данесці да гледача ідэйна-мастацкі змест арыгіналу.

Для таго, каб узняць справу перакладу п'ес, пакласці канец недапушчальнаму саматужніцтву, якое вядзе да скажэння якасці спектакляў, Упраўленне па справах мастацтваў павінна ўзяць пераклад п'ес на беларускую мову ў свае рукі, бо яно мае больш магчымасцей прыцягнуць для перакладчыцкай работы кваліфіцыраваных літаратараў БССР.

М. ВОЛГІНА.

Літаратурны вечар у Мінскім пяхотным вучылішчы

Упраўленне палітычнай прапаганды штаба Заходняй Асобай Ваеннай Акругі рашыла, па прыкладу мінулых год, склікаць у маі бягучага года шырокую нараду чырвонаармейскіх пісьменнікаў сумесна з членамі Саюза пісьменнікаў БССР, якія пішуць на абаронныя тэмы.

У парадку падрыхтоўкі да гэтай нарады абаронная камісія ССП БССР праводзіць цыкл літаратурных вечароў непасрэдна ў чырвонаармейскіх часцях, палкавых клубах, Дамах Чырвонай Арміі.

Адзін з такіх вечароў адбыўся ў Мінскім пяхотным ордэна Чырвонага Сцяга вучылішчы імя М. І. Калініна. Прыезд брыгады пісьменнікаў сабраў у клубе вучылішча вялікую аўдыторыю. Сярод прысутных—будучыя лейтэнанты Чырвонай Арміі, камандзіры, палітработнікі, жонкі начальніцкага складу, абслугоўваючы персанал.

Вечар адкрыў начальнік клуба старшы палітрук тав. Астроўскі. Крытык Г. Бярозкін ва ўступным слове ахарактарызаваў апошнія творчыя работы беларускіх пісьменнікаў, падкрэсліўшы, што не малую ўвагу беларускія пісьменнікі аддаюць першачарговай па сваёй важнасці абароннай тэме.

З вялікай увагай праслухалі прысутныя выступаўшых з чыткай сваіх твораў пісьменнікаў: палкоўніка Н. Аляксеева, М. Клімковіча, А. Куляшова, батальённага камісара М. Кручкіна, старшага палітрука Л. Шапіра, пісьменнікаў Л. Талалая, Е. Садоўскага.

Курсант вучылішча, актыўны ваенкор О. Вачнадзе прачытаў свой верш «Лапата».

У заключэнне выступіў батальённы камісар тав. Дземідэнка, які заявіў, што з ліку курсантаў і камандзіраў вучылішча ствараецца літаратурнае аб'яднанне, адной з галоўных задач якога будзе актыўны ўдзел у напісанні гісторыі вучылішча.

Літаратурныя выступленні трансліраваліся праз радыё па ўсяму гарадку ваеннага вучылішча.

Е. ІГАРАЎ.

Нік. Сурначоў

На ростані

Гадзіну горнымі наростамі
Хадзіў і не абдумаў толкам,
Што, стоячы з табой на ростані,
Цябе пакрыўджу словам колкім,

Цяпер з самотай надаедлівай
Дружы і радуйся, як хочаш, —
Адходзячы, глядзіць прыветліва,
Не кажучы: спакойнай ночы.

Відаць, слядамі неглыбокімі
Даўнейшай дружбы шлях адзначан,
Калі суседзямі далёкімі
Становімся пасля няўдачы.

А крыўдна!
З тонкаю вяршыняю,
Падмытая з бакоў даждкамі,
Скала махае шапкай сіняю,
Навечна стаўшы паміж намі.

Пяцігорск.

Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР паказаў прэм'еру спектакля «Зачараваны кравец» паводле Шолам-Алэйхема. Пастаноўка Н. Лойтэра, мастак Р. Фальк. **На здымку** (злева направа): артыстка **Э. Дрэйзіна** ў ролі Двейрэле, заслужаны артыст БССР **А. Трэпель** у ролі Шымен-Элі (краўца) і артыстка **М. Чайгорская** ў ролі Аўрэмелэ.

Фота І. Каплінскага.



У Тэатральным вучылішчы БССР. Выдатнікі вучобы выпускнога IV курса **Л. Іваноў** (справа) і **А. Говар-Бандарэнка** пад кіраваннем народнага артыста БССР **Е. Міровіча** (за сталом) рэпеціруюць да залікаў III акт п'есы «Дзеці Ванюшына» Найдзёнава.

Фота С. Вальфсона (БЕЛТА).

У тэатральным вучылішчы

Навучальны год набліжаецца да канца; да заліковай сесіі засталося два месяцы. Студэнты напружана працуюць над п'есамі, вадэвілямі, паасобнымі актамі і ўрыўкамі з п'ес, выбраных для заліковых работ па майстэрству актора.

Па сцэнічнай мове студэнты пад кіраваннем Г. Тушмалавай рыхтуюць да залікаў творы беларускіх, рускіх і заходнееўрапейскіх класікаў і лепшыя творы сучаснай літаратуры.

У гэтым годзе адбудзецца першы выпуск Тэатральнага вучылішча БССР. 13 студэнтаў-выпускнікоў будуць накіраваны на работу ў драматычныя тэатры БССР. К выпуску чацвёрты курс рыхтуе спектаклі «Дзеці Ванюшына» С. Найдзёнава ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка вучылішча—народнага артыста БССР ордэнаносца Е. Міровіча і «Тракціршчыца» К. Гальдоні ў пастаноўцы заслужанай артысткі БССР ордэнаносца О. Галіны.

Трэці курс пад кіраваннем педагога Е. Асенкавай рыхтуе да залікаў 1 акт «Норы» Г. Ібсена, 1 акт «Самадураў» К. Гальдоні і «Мядзведзь» А. Чэхава. Другі курс рыхтуе: першая група — II акт п'есы «Мяшчане» М. Горкага і вадэвіль «Бяда ад пяшчотнага сэрца» Ф. Салатуба (педагог—заслужаны артыст БССР М. Зораў), другая група—I і IV акты п'есы «Свеціць, ды не грэе» А. Астроўскага і вадэвілі: «Любоўнае зелле» Ленскага і «Няма блага без дабра» Хмяльніцкага (педагог Е. Асенкава).

У канцы красавіка ў мінскім Палацы піянераў адбудзецца паказ усёй работы вучылішча, на якім будуць прадэманстрыраваны ўсе этапы работы па падрыхтоўцы будучага актора.

В. Л.

Поспех вечароў мастацкага чытання

Па ініцыятыве Тэатральнага вучылішча ў мінскім Доме пісьменніка праводзіцца цыкл вечароў мастацкага чытання.

Гэтыя вечары, арганізаваныя як сістэматычныя канцэрты па пэўнаму плану, з'яўляюцца вельмі цікавым і каштоўным пачынаннем, якое павінна адыграць вялікую ролю, як у справе развіцця культуры мастацкага слова, так і ў справе ўвасаблення сродкамі мастацкага чытання вобразаў лепшых твораў рускай і заходнееўрапейскай класікі, твораў рускіх і беларускіх савецкіх пісьменнікаў.

Прайшло ўжо 5 вечароў, на якіх выконваліся творы Горкага, Чэхава, Пушкіна, Маякоўскага, Мапасана, Бальзака, Мерымэ, Барбюса, Н. Астроўскага, Шолахава, Багрыцкага, Есеніна і Лугаўскога. З чыткай выступалі заслужаны артыст БССР ордэнаносец С. Бірыла і артыстка З. Бравapская (Беларускі драмтэатр), Я. Скальскі (Радыёкамітэт) і студэнты тэатральнага вучылішча: Л. Іваноў, П. Зіньковскі, З. Кагановіч, М. Міронічык. 14 красавіка адбудзецца вечар, прысвечаны памяці В. Маякоўскага.

У будучым сезоне мяркуецца працягнуць правядзенне вечароў мастацкага чытання, уключыўшы ў іх праграму чэхаўскія вадэвілі ў канцэртным выкананні, пушкінскія «маленькія трагедыі», урыўкі з шэкспіраўскіх трагедый і камедый.

В. Л.

Старэйшы мастак-педагог

У Мінску жыве адзін са старэйшых мастакоў-педагогаў Беларусі — Герасім Майсеевіч Пінус.

Г. Пінус з'яўляўся дзейсным удзельнікам усіх мінскіх мастацкіх выставак даваеннага часу (1908 — 1913) і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі: 1-й мастацкай выстаўкі 1921 года, дзе мы бачылі рад яго работ у галіне пейзажу, і 2-й мастацкай выстаўкі ў 1927 годзе.

Асабліва вядомы Г. Пінус як педагог—выкладчык графічных навук. На педагагічнай рабоце Г. Пінус беспярэпынна працуе 39 год — у мясцовых навучальных установах: школах, рабфаках, тэхнікумах, інстытутах, на курсах розных профіляў, у клубах і г. д.

З вучняў Г. Пінуса вядомы т. т. Ахрэмчык, Аксельрод і рад іншых таварышоў, якім гэты мастак-педагог прывіў любоў да выяўленчага мастацтва, словамі і справай дапамог на першых кроках іх самастойнай мастацкай творчасці.

З мастацкай творчасцю Г. Пінуса варта азнаёміць шырокую грамадскасць шляхам паказу яго твораў на чарговай групавой выстаўцы мастакоў-пейзажыстаў.

Днямі праўленне Саюза савецкіх мастакоў БССР пастанавіла ўвайсці з хадайніцтвам у Наркамасветы і ЦК саюза пачатковых і сярэдніх школ аб устанаўленні тав. Пінусу персанальнай пенсіі.

С. ПАЛЕЕС.

У Брэсце пражывае сям'я Кавальскіх, кожны член якой іграе на якім-небудзь музычным інструменце. **На здымку:** сям'я Кавальскіх. Злева направа: віяланчэлістка Дуся, скрыпачка Перла, піяністка Ізя, саксафаніст Давід, акардэяністка Геня, глава сям'і Абрам Янкелевіч і акардэяністка Лена.

Фота В. Лупейкі (БЕЛТА).

Аб канцэртах філармоніі

Дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія БССР 31 сакавіка начала сваю работу ў новай канцэртнай зале. Адкрыццё новай залы заклала моцную аснову для развіцця канцэртнай дзейнасці філармоніі, тым самым стварыла прадпасылкі для прад'яўлення да яе больш жорсткіх патрабаванняў.

Падбіраючы праграму канцэрта для адкрыцця новай залы (31 сакавіка), філармонія, трэба проста сказаць, не праявіла вялікага мастацкага густу. Выконваемыя творы следавалі ў самым дзіўным парадку, ствараючы ўражанне выпадковасці. У праграму, пабудаваную, па сутнасці, з твораў рускіх і савецкіх кампазітараў (прычым з твораў, не заўсёды лепшых), у якую ў выглядзе выключэння, як узор найвялікшага майстэрства, уключан фінал 9-й сімфоніі Бетховена, раптам уклінваецца, невядома чаму, арыя з оперы Вердзі «Бал-маскарад» альбо маламастацкі эцюд з п'есы Левіна «Лейбке-салдат». Калі дадаць да гэтага неверагодную колькасць выконваемых твораў, дык мімаволі ўзнікае аналогія з крылоўскай «дзям'янавай ухой».

Усё-ж, не зважаючы на рад недахопаў, канцэрт пакінуў добрае ўражанне, калі не лічыць няўдалае выкананне фінала бетховенскай сімфоніі. Паказ калектываў філармоніі быў бясспрэчнай дэманстрацыяй іх росту. Калі слухачам Мінска часта прыходзілася прысутнічаць на канцэртах сімфанічнага аркестра (дырыжор І. Мусін), дык выступленні хора (дырыжор І. Бары), аркестра народных інструментаў (дырыжор Г. Самохін) і ансамбля песні і пляскі (мастацкі кіраўнік І. Любан) не заўсёды мелі месца ў Мінску, і тым лягчэй было ацаніць іх поспехі.

Узбагачэнне рэпертуару калектываў творамі беларускіх кампазітараў з'яўляецца значным дасягненнем філармоніі. Уверцюра для сімфанічнага аркестра Н. Аладава — бадзёры, аптымістычны твор, пабудаваны на напеўках беларускіх народных песень, з дасціпнейшай інструментоўкай; каларытная, гучная, праніззаная народным меласам частка з танцавальнай сюіты для аркестра народных інструментаў Н. Чуркіна; задушэўнейшая апрацоўка беларускай народнай песні «Зязюлечка» І. Любана і рад іншых твораў, безумоўна, з'явіліся цікавейшымі элементамі канцэрта.

Дасягненнем, нарэшце, з'яўляецца і прыцягненне да ўдзелу ў канцэртах артыстаў драматычных тэатраў (у прыватнасці, Ю. Аронцык і М. Моіна). Прыцягненне лепшых салістаў оперы і кансерваторыі да ўдзелу ў канцэртах філармоніі лічыцца «у парадку рэчаў», аднак выступленне ў адным канцэрце М. Дзянісава, Р. Млодэк, С. Друкер і А. Амітона ўнесла ў яго пэўную святочнасць і ўрачыстасць. Дакладнасць аддзелкі выконваемых твораў, высокае майстэрства і музыкальная культура — усё гэта і ў будучым робіць іх пажаданымі выканаўцамі канцэртаў.

Маладой салістцы аркестра народных інструментаў Е. Цітовай шмат яшчэ трэба папрацаваць над сабой, каб усвядоміць і адчуць усю паэзію і выканаўчую асаблівасць беларускай народнай песні і яе лепшых стылізацый.

***

Па няўдаласці ў выбары праграмы з канцэртам 31 сакавіка, бадай, можа канкурыраваць дзіцячы ранішнік 6 красавіка, праграма якога была аб'яднана тэмай «Пушкін у музыцы». Аднак, калі ў першым канцэрце было праяўлена мала густу, дык тут было мала праяўлена такту ў адносінах да дзяцей. Сапраўды, на канцэрце прысутнічалі дзеці ад 8 да 14 год, а ў праграму былі ўведзены такія творы, як «У крыві гарыць агонь жаданняў» Глінкі, «Закліананне» Шапорына, арыя млынара з оперы «Русалка» Даргамыжскага і рад іншых, якія ні ў якой меры не адпавядаюць успрыняццю дзяцей. У той-жа час рад твораў, блізкіх дзецям (напрыклад, «Бура імглою...», арыя царэўны-лебедзя з казкі «Аб цару Салтану» і інш.) — не былі выкарыстаны. Між тым, нельга сказаць, што філармонія не праявіла належнай ініцыятывы ў выбары тэматыкі канцэрта для дзяцей альбо ў выкарыстанні лепшых выканаўчыцкіх сіл (сімфанічны аркестр пад кіраваннем К. Сімеонава, артысты З. Бравapская, Р. Млодэк і В. Таланкін, выдатны дзіцячы лектар, дацэнт Дзяржаўнай кансерваторыі БССР Б. Грынбліт). Знаходзячыся на повадзе артыстаў, яна па-простау выкарыстала наяўны ў іх матэрыял, які, як бачым, прышоўся недарэчы. Адсутнасць хронаметражу прывяла да непрадбачанага скарачэння праграмы першага аддзялення, у выніку — лектар гаварыў аб вальсе з балета «Спячая красуня», які потым не выконваўся. Цяжкая для дзіцячага ўспрыняцця і ўступная лекцыя аб выконваемай праграме, — ці не лепш весці тлумачэнні перад кожным выконваемым творам?

Дзіцячыя ранішнікі для школьнікаў — добрае мерапрыемства, якое трэба вітаць. Але да гэтай справы трэба падыйсці з усёй сур'ёзнасцю. Лепшым пажаданнем трэба лічыць, напрыклад, каб да складання праграм быў прыцягнут спецыяліст па музычнаму выхаванню дзяцей Б. Грынбліт.

Выкананне ўсёй праграмы было на вялікай вышыні (незразумела, аднак, чаму быў узят замаруджаны тэмп у «рандо» Фарлафа з оперы «Руслан і Людміла» Глінкі, — саліст В. Таланкін). Артысты не рабілі сабе ніякіх скідак і, не гледзячы на тое, што канцэрт быў прызначан для маленькіх слухачоў, аднесліся з усёй уласцівай ім добрасумленнасцю і сур'ёзнасцю да выканання.

З вялікай эмацыянальнасцю, літаральна зачароўваючы слухачоў, прачытала «Сон Таццяны» з «Еўгенія Онегіна» Пушкіна артыстка З. Бравapская. Вялікае ўражанне ўтварылі песня Варлаама «Як ва гарадзе, ва Казані» з оперы «Барыс Гадуноў» Мусаргскага і (злашчасная) арыя млынара ў выкананні артыста Таланкіна, а таксама ўся праграма (зусім не для дзяцей) выканання артысткі Млодэк. Дасканала прагучала уверцюра да оперы Глінкі «Руслан і Людміла» (дырыжор Сімеонаў). Лектар Б. Грынбліт вёў усю праграму жвава і даходчыва для дзіцячага ўспрыняцця.

***

Канцэрт 7 красавіка — адзін з лепшых. Сімфонія «рэ-мінор» кампазітара Цэзара Франка — выдатны твор, які ўпершыню выконваўся ў Мінску. Следуючы традыцыі сімфоніі Ліста «Фауст» — яна з трох частак, але ўсе часткі аб'яднаны адзіным вобразам. Гэты «монатэматызм» добра ўдалося перадаць дырыжору І. Мусіну. Сузіральная эмацыянальнасць першай часткі (з яе двума тэмамі — музыкальнага разуму і лірычнай, песеннага характару), пейзажная апісальнасць другой і, нарэшце, актыўны і дынамічны фінал, які развівае асноўныя музыкальныя ідэі папярэдніх частак, — усё гэта гучала з уласцівай для данага твора рамантычнай афарбоўкай. Асабліва ясна была прадстаўлена першапачатковая мысль сімфоніі — інтанацыя «пытання».

Выкананне буйнага твора такога майстра, як Цэзар Франк, у творчасці якога праз прызму асабістага светасузірання гібка і арганічна пераплятаюцца паліфанічныя прыёмы Баха і маляўнічыя кантрасты Ліста, з'яўляецца вельмі радаснай падзеяй, тым больш што нават камерныя творы Цэзара Франка ў нас чамусьці не выконваюцца.

Канцэрт Шапэна (f-moll) — даволі вядомы і часта выконваемы твор. Салістка — лаўрэат міжнароднага конкурса піяністаў імя Шапэна Галіна Калмановіч (гор. Вільнюс) — безумоўна таленавітая піяністка, валодае выдатнай тэхнікай і глыбокім прыгожым гукам. Аднак, глыбіні ў трактоўцы канцэрта і выконваемых на «біс» дробных твораў Шапэна (эцюд, накцюрн і інш.) у яе не назіраецца. Запрашэнне і знаёмства мінскіх слухачоў з лепшымі выканаўцамі братніх рэспублік — добрае мерапрыемства філармоніі.

***

Філармонія, як ужо адзначалася, пачала праводзіць вялікую і цікавую работу. Запрашэнне пастаяннага лектара—дацэнта Дзяржаўнай кансерваторыі БССР А. Карповіча, які вядзе тлумачэнне ўсіх канцэртаў, робіць іх даступнымі для шырокага круга слухачоў.

Належную ўвагу павінна звярнуць філармонія на чыстату інтаніравання асобных груп і выканаўцаў аркестра (напрыклад, на валторны), а часамі і на хор (напрыклад, 31 сакавіка пры выкананні «Тайгі» Егорава).

Павышаныя патрабаванні як да складання праграм канцэртаў, так і да іх выканаўцаў з'явяцца залогам далейшага росту Дзяржаўнай філармоніі БССР, бо яна павінна стаць сапраўдным цэнтрам музыкальнай культуры Беларусі. Для гэтага ў яе ёсць усе магчымасці.

С. НІСНЕВІЧ.

Адказны рэдактар **І. Д. ГУРСКІ.**

У1916. Мінск, друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394.